ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 52 (2001)
29 чэрвеня 1965 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ЧАЦВЁРТЫ РАЗ НА КРАМЛЁЎСКАЙ СЦЭНЕ

Днямі Дзяржаўны ансамбль танца Беларускай ССР (мастацкі кіраўнік — заслужаны дзеяч мастацтва БССР А. Апанасенка) у чацвёрты раз за сваё параўнальна невялікае творчае жыццё выступіў на сцэне Крамлёўскага Палаца з'ездаў. Так налектыў ансамбля даў два канцэрты, уключыўшы ў іх праграму аднаактовы харэаграфічны спектакль «Беларуская партызанская», а тансама танцы, якія маскоўскія гледачы ўбачылі ўпершыню,— «Рускія ўзоры», «Мяцеліца» (у новай рэдакцыі), танцавальны дуэт «Паўлінка» і іншыя.

Масквічы па вартасці ацанілі высокае майстэрства і культуру выканання беларускіх артыстаў.

Ансамбль пабываў у падмаскоўным прамысловым горадзе Каломне, дзе ўдзельнічаў у вялікім мясцовым «Свяце працы», а тансама выступіў з канцэртнай праграмай у Зялёным тэатры Цэнтральнага парку культуры і адпачынку імя Горкага.

Цяпер Дзяржаўны ансамбль танца БССР гастраліруе па гарадах Маскоўскай вобласці.

Майстар-аздабляльнік вышэйшай кваліфікацыі — такое званне з гонарам носіць Георгій Барысавіч Лінкевіч, член эксперыментальнай брыгады шклозавода «Нёман». У садружнасці з заводскімі мастакамі ён стварае ўнікальныя сувеніры і высокамастацкія вырабы са шкла.

Фота А. ПЕРАХОДА. (БЕЛТА).

СУСТРЭЧЫ ДРУЖБЫ

Беларуснія госці ў рабочых Вільнюскага завода свёрдлаў.
Фота Яўгена ШЫШКО.

НАПЯРЭДАДНІ 25-годдзя Савецкай Літвы ў гасцях у працоўных нашай рэспублікі пабывалі пасланцы вялікага рускага народа і братняй Украіны.

А ў гэтыя дні працоўныя літоўскай рэспублікі цёпла і сардэчна прымалі гасцей з Беларусі — намесніка міністра культуры БССР Р. Мачуліна, паэтаў М. Танка і М. Калачынскага, кампазітара Ю. Семяняку і саліста Дзяржаўнага акадэмічнага ордэна Леніна Вялікага тэатра оперы і балета А. Бокава.

Беларускую дэлегацыю на вільнюскім вакзале сустрэлі загадчык аддзела ЦК КП Літвы П. Мішуціс, міністр культуры Літоўскай ССР Ю. Банайціс, першы сакратар ЦК ЛКСМ Літвы А. Часнавічус, старшыня Вільнюскага гарвыканкома І. Вільджунас, намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў рэспублікі паэт Ю. Марцінкявічус, работнікі культуры, журналісты.

Увечары 24 чэрвеня беларускія госці сустрэліся ў канцэртнай зале Дзяржаўнай кансерваторыі з грамадскасцю сталіцы братняй Літвы. У сустрэчы прыняў удзел першы сакратар ЦК КП Літвы А. Снечкус, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР Ю. Палецкіс, намеснік старшыні Савета Міністраў ЛССР Л. Дзіржынскайтэ і іншыя кіруючыя работнікі рэспублікі.

Адкрываючы вечар беларуска-літоўскай дружбы, старшыня Вільнюскага гарвыканкома І. Вільджунас гаварыў пра даўнюю дружбу братніх народаў Літвы і Беларусі, пра іх сумесную барацьбу за сваё шчасце ў мінулым і будаўніцтва новага жыцця сёння. Ён папрасіў гасцей перадаць прывітанне былым беларускім партызанам, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны аказвалі вялікую дапамогу літоўскім народным мсціўцам у барацьбе супраць гітлераўскіх акупантаў.

Пра поспехі беларускага народа ў галіне эканомікі і культуры расказаў кіраўнік дэлегацыі Р. Мачулін. Ён прывёў шмат яркіх і пераканаўчых прыкладаў, якія сведчаць, як пад кіраўніцтвам партыі беларускі народ дамагаецца значных поспехаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і культуры. Многа прачулых слоў прысвяціў Р. Мачулін мацнеючым сувязям паміж дзеячамі мастацтва, культуры і літаратуры двух братніх народаў.

На вечары дружбы гучалі вершы паэтаў М. Танка і М. Калачынскага, прысвечаныя Літве. У гэты вянок паэзіі ўлілася голас літоўскага паэта Ю. Марцінкявічуса, вялікага сябра беларускай літаратуры.

У заключэнне адбыўся канцэрт. Разам з літоўскімі спевакамі выступіў і саліст Беларускага тэатра оперы і балета А. Бокаў.

Удзельнікамі гэтай хвалюючай сустрэчы былі не толькі прысутныя ў зале, а і сотні тысяч тэлегледачоў Літвы.

25 чэрвеня госці з братняй Беларусі наведалі Вільнюскі завод свердлаў — буйнейшае сучаснае прадпрыемства. Дэлегаты гутарылі з рабочымі, сустракаліся са сваімі землякамі, якія працуюць на прадпрыемстве. На гэтым заводзе ўстаноўлены і бездакорна працуюць станкі, зробленыя на беларускіх прадпрыемствах.

Беларускія госці наведалі вёску Пірчупіс. У гады вайны ў гэтай вёсцы адбылася страшная трагедыя: азвярэлыя фашысцкія каты спалілі ўсіх жыхароў вёскі. Госці пабывалі ў мясцовым музеі, агледзелі новую вёску, якая вырасла за пасляваенныя гады на месцы былых руін і папялішчаў. Цяпер тут жывуць і працуюць калгаснікі сельгасарцелі «Пірчупіс».

У гэты ж дзень беларуская дэлегацыя пабывала ў маляўнічым Тракаі — горадзе, які размешчаны на шматлікіх азёрах.

Цікавае было падарожжа ў Каўнас. Па дарозе дэлегацыя азнаёмілася з новым пасёлкам Электранай, дзе жывуць і працуюць энергетыкі і будаўнікі Літоўскай дзяржаўнай раённай электрастанцыі. Гэта — прыгожы сучасны гарадок. Тут будуюцца вялікія шматпавярховыя жылыя дамы, ёсць сярэдняя і музычная школы, працуе філіял політэхнічнага інстытута.

На беразе жывапіснага водасховішча — Каўнаскага мора — размясціўся піянерскі лагер. Тут беларускія госці сустрэліся з літоўскімі школьнікамі і піянерамі. Разам яны спявалі песні, чыталі вершы. Гэта была сапраўды хвалюючая і незабыўная сустрэча.

У Каўнасе беларуская дэлегацыя наведала папяровую фабрыку імя Яноніса, пабывала на гідраэлектрастанцыі. Паэт М. Калачынскі сказаў:

— Я бываў у гэтых мясцінах, калі толькі закладвалі падмурак бетоннай плаціны. А цяпер глядзіце, якая прыгажуня вырасла! Наш бацька Нёман верціць магутныя турбіны гідраэлектрастанцыі. Нёман нясе свае воды па зямлі дзвюх братніх рэспублік. Выпрацаваная тут электраэнергія запальвае агні не толькі ў вас, але і на нашай беларускай зямлі.

Цікавае было знаёмства з юбілейнай выстаўкай работ каўнаскіх мастакоў, якая экспануецца ў Мастацкім музеі імя Чурлёніса.

Беларускія госці пабывалі ў музеі 9-га форта, дзе ў час Вялікай Айчыннай вайны загінулі тысячы савецкіх патрыётаў. Мінутай маўчання ўшанавала дэлегацыя памяць ахвяр фашызму.

У нядзелю, 27 чэрвеня, беларускія госці прымалі ўдзел у традыцыйным вясёлым і звонкім свяце песні, якое адбылося ў раённым цэнтры Крэцінга.

Поўны незабыўных уражанняў быў і панядзелак — дзень знаёмства з літоўскім горадам-портам — Клайпедай.

Сёння беларуская дэлегацыя пакідае гасцінную літоўскую зямлю.

Дні літоўска-беларускай дружбы — яшчэ адно яркае сведчанне непарушнай даўняй братэрскай дружбы двух народаў-суседзяў.

Іонас БАГДАНСКІС.
Георгій ТАРАНОВІЧ.

г. Вільнюс.

АД АГІТБРЫГАДЫ — ДА АГІТТЭАТРА

ПАД такой рубрыкай на старонках нашай газеты вялася гаворка аб праблемах далейшага развіцця агітбрыгад — самых папулярных і баявых калектываў мастацкай самадзейнасці рэспублікі.

Гэтай жа тэме быў прысвечаны семінар-канферэнцыя кіраўнікоў і творчага актыву мастацкіх агітбрыгад, праведзены Рэспубліканскім Домам народнай творчасці, на якім былі падсумаваны вынікі абмеркавання, што вялося на старонках газеты. З уступным словам выступіла загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» Я. Данская.

Сваімі думкамі і вопытам работы на семінары-канферэнцыі падзяліліся дырэктар Магілёўскага абласнога Дома народнай творчасці Ул. Бараноўскі, рэжысёр Рагачоўскага народнага тэатра, кіраўнік агітбрыгады раённага Дома культуры К. Катлінскі, дырэктар Лёзненскага РДК Р. Траяноўскі, метадысты Мінскага, Гомельскага і Віцебскага абласных Дамоў народнай творчасці М. Кулінец, Т. Скобава, В. Маёраў, старшы інспектар Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры М. Кліменка, рэжысёр Лідскага народнага тэатра П. Дакука, кіраўнік драматычнага калектыву Жлобінскага РДК Э. Яфімава, мастацкія кіраўнікі раённых Дамоў культуры — Ваўкавыскага — У. Шклярскі і Дзятлаўскага — У. Мацюк, загадчыца Брухаўскага сельскага клуба Аршанскага раёна Л. Мацієвіч, заслужаная настаўніца школ рэспублікі, кіраўнік агітбрыгады Цімкавіцкай сярэдняй школы Капыльскага раёна З. Раманенка, дырэктар Ганцавіцкага пасялковага Дома культуры Ляхавіцкага раёна К. Богдан, метадыст РДНТ А. Радзівілаў, мастацкі кіраўнік Полацкага ГДК Л. Казлоў, дырэктар Рэспубліканскага Дома народнай творчасці Г. Талчынская, метадыст метадычнага кабінета культасветработы Міністэрства культуры БССР В. Кальцоў, намеснік начальніка упраўлення культасветустаноў Міністэрства культуры БССР Ф. Барысевіч.

Прамоўцы адзначалі, што ўзровень лепшых агітбрыгад рэспублікі дазваляе сёння ставіць пытанне аб пераўтварэнні іх у народныя агітбрыгады, агіттэатры, тэатры сатыры і гумару.

На семінары-канферэнцыі выступілі заслужаны дзеяч мастацтва БССР кампазітар Д. Лукас, народны артыст рэспублікі Г. Цітовіч, заслужаны дзеяч культуры рэспублікі С. Грабеншчыкаў, галоўны рэжысёр Дзяржаўнага тэатра лялек А. Ляляўскі, заслужаны артыст рэспублікі Б. Янпольскі, пісьменнікі К. Цвірка, А. Махнач, М. Скрыпка, А. Астрэйка, В. Маеўскі, якія падзяліліся сваімі ўражаннямі аб выступленнях асобных агітбрыгад, далі шэраг карысных парад, як лепш і цікавей будаваць работу гэтым самадзейным калектывам, як стварыць сцэнарыі тэатралізаваных аглядаў.

ДЫСКУСІІ
На парадку дня:
ПРАБЛЕМЫ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Ул. ЖЫЖЭНКА:

ШТО ЗАСТАЛОСЯ ПА-ЗА СПІСАМ...

НАЙЛЕПШ было б называць гэтыя нататкі, скажам, «адкрытым пісьмом крытыку». Гэты жанр, які ў нас, праўда, не вельмі ў пашане, дазваляе паслядоўна спыняцца на кожным сцвярджэнні «папярэдняга прамоўцы» і згаджацца або аспрэчваць яго. Артыкул настаўніка Б. Зубкоўскага «Чым будуць абавязаны...» не пакідае раўнадушным: з ім увесь час хочацца або горача спрачацца, або згаджацца. Згаджацца таму, што ён, відаць, прадыктаваны шчырай заклапочанасцю становішчам спраў у «дзіцячым цэху» нашай літаратуры, спрачацца — бо аўтар не-не ды і скарыстае не заўсёды прыдатны ў крытыцы выраз «і інш.».

Магчыма, тут свядомы прыём — раскалыхаць думку, выклікаць спрэчкі. Але бяда аўтара хутчэй за ўсё ў тым, што ён паставіў перад сабой вельмі шырокую задачу, паспрабаваў — як ён сам піша — абняць неабдымнае, а гэта, відаць, немагчыма.

Раней чым падысці да першага «і інш.», некалькі слоў пра тое, з чым нельга не пагадзіцца.

ТАК, да юнага чытача даволі часта яшчэ трапляюць шэрыя, нецікавыя, маламастацкія кнігі. Ну, што яны «часам прыносяць шкоду» — гэта, мусіць, варта было б пацвердзіць прыкладамі. Хутчэй такія кнігі проста слаба, не на поўную сілу ўздзейнічаюць на розум і сэрца чытача.

«У чым справа?» — ставіць пытанне Б. Зубкоўскі і адну з прычын называе, безумоўна, правільна: мала цікавіцца дзіцячай літаратурай наша крытыка. Калі пайсці далей, дык гэта вынік вельмі старога і дзіўнага погляду на дзіцячую літаратуру, як на нешта такое, што яшчэ павінна даказаць сваё права на існаванне. Трэба думаць, гэтае права даўно даказана на практыцы, але стары погляд недаверу яшчэ жывы — ён сказваецца і ў школьных праграмах, і часам у практыцы Саюза пісьменнікаў, і ў дзейнасці больш высокіх устаноў, якім належыць дбаць пра выхаванне маладой змены.

У крытыкаў той самы довад: «Ат, пра што там пісаць!»

А пісаць сёння ёсць пра што.

Успомніце першыя пасляваенныя гады, пагартайце выдавецкія планы тых часоў — амаль адны зборнікі вершаў і апавяданняў.

А сёння?

Перш за ўсё адзначаеш незвычайнае пашырэнне жанравага і тэматычнага дыяпазону літаратуры для дзяцей. Побач з традыцыйнымі жанрамі ўсё большае месца займае мастацкі нарыс — не той, нудны, бясколерны, што пачынаўся і канчаўся сумнымі лічбамі, а сапраўды мастацкі, сапраўды вобразны.

Узяць хоць бы краязнаўчую тэму. У свой час адыграла пэўную ролю кніжка С. Палееса «Па роднай Беларусі» — яна была першай ластаўкай. Сёння мы ўжо маем «энцыклапедыю» беларускай прыроды — кнігу Віталія Вольскага «Родны край». А ў апошні час пісьменнік яшчэ больш пашырыў геаграфічныя гарызонты нашай літаратуры, выдаўшы адну за адной дзве кнігі пра сваё афрыканскае падарожжа.

А кніжка Аляксея Сінілава «Сцежкамі Прыняманння», у якой публіцыстычны грамадзянскі пафас спалучаецца з выдатнымі апісаннямі роднай прыроды, жывы паказ сённяшняга дня рэспублікі — з роздумам пра яе гістарычны лес! А зборнік турысцкіх нарысаў «Клічуць шляхі-дарогі»! І гэта яшчэ далёка не ўсё.

Адбыліся змены і ў суадносінах традыцыйных мастацкіх жанраў. 15 год назад дзіцячая аповесць была падзеяй, цэлым святам, а ў тэматычным плане выдавецтва на 1965 год — восем новых аповесцей, не лічачы перавыданняў. Ці ж гэта не прыкмета ўзмужнеласці літаратуры!

У апошнія гады рост дзіцячай літаратуры ідзе асабліва бурна. Колькі ў ёй з'явілася новых імёнаў, колькі здольнай моладзі! А крытыка ўпарта не хоча гэтага заўважаць, упарта трымаецца за сваё: «Ат, пра што там пісаць!»

Вось і атрымліваецца, што замест глыбокіх ацэнак, заснаваных на аб'ектыўным разглядзе мастацкіх вартасцей той ці іншай дзіцячай кнігі, мы карыстаемся нейкімі ўскоснымі крытэрыямі: ці перавыдавалася кніга ў перакладзе на рускую мову, ці выходзіла ў Маскве?

Я не памятаю, напрыклад, грунтоўнага крытычнага артыкула пра «Шосты акіян» Міколы Гамолкі — першы пасля «Амока» раман для дзяцей у нашай літаратуры і першы буйны твор на навукова-фантастычную тэму. Яго лёс вырашыла хлёсткая рэпліка ў «Литературной газете». З'явілася рэпліка — кіраўніцтва Міністэрства культуры паспяшалася прызнаць памылку выдавецтва, якое па заяўцы кнігагандлю выдала раман на рускай мове масавым тыражом, і запэўніць «Литгазету», што больш ён ніколі перавыдаваць не будзе.

Гэта гаворыцца не ў абарону рамана Міколы Гамолкі — я супраць такой крытыкі, якая абражае пісьменніка і ў іншых адбівае ахвоту працаваць у галіне навуковай фантастыкі — любімага жанру нашай дзятвы.

Недахопы рамана хутчэй у мастацкім вырашэнні тэмы, чым у навукова-тэарэтычных выкладках, і крытыка павінна была сказаць сваё слова. Можа, у рускім варыянце ён пазбавіўся б найбольш істотных хібаў, а можа і наогул перавыданне не ўбачыла б свету.

Думаецца, што крытыка якраз заклікана кантраляваць працэс выдання і перавыдання дзіцячых кніг — як і ўсіх іншых. Але гэта пакуль толькі мара.

ГАВОРАЧЫ аб прычынах, якія адкрываюць дарогу да юнага чытача слабой, павярхоўнай кнізе, Б. Зубкоўскі выказвае, паміж іншым, і такое меркаванне: «А можа, у работнікаў выдавецтва выпрацаваліся нейкія заніжаныя меркі ў падыходзе да дзіцячай кнігі?» У гэтым рытарычным пытанні — амаль сцвярджэнне і, на маю думку, небяспечнае, бо можа павесці да непажаданых вываду.

Ніхто, бадай, не назаве выпадку, каб добры рукапіс доўга адлежваўся ў рэдакцыі дзіцячай літаратуры (маецца на ўвазе выдавецтва «Беларусь»), чакаючы, пакуль убачаць свет яго пасрэдныя, але больш шчаслівыя супернікі. Значыць, гаворка фактычна ідзе аб тым, каб штучна затрымаць колькасны рост літаратуры, зменшыць лік выданняў.

Такое пытанне паўставала калісьці ў кіно. Знайшліся дзеячы, якія гаварылі: «Навошта нам здымаць сто фільмаў у год? Няхай іх будзе лепш тры ці пяць, але затое добрыя». Няцяжка сабе ўявіць, што было б, калі б гэтая «тэорыя» ўзяла верх.

І дзіцячая рэдакцыя робіць стаўку на тое, што сярод сотні кніг хутчэй, чым сярод трыццаці, знойдзецца дзесятак па-сапраўднаму добрых, якія на доўгі час застануцца здабыткам літаратуры. Больш клопату, але затое больш і надзеі на поспех. А калі часам выходзіць у свет і вельмі слабая кніга, дык тут трэба бачыць прыкрую памылку, чыйсці недагляд, а не дзеянне нейкага агульнага закону.

І яшчэ адно трэба мець на ўвазе: можа, сёй-той і не прыкмячае гэтага, але патрабавальнасць рэдакцыі да ўсяго, што трапляе ў «рэдакцыйны партфель», з году ў год расце. Тое, што ўчора часам задавальняла, сёння ўжо нават лічыцца пазамежамі літаратуры. І яна, гэтая патрабавальнасць, натуральна будзе расці разам з ростам самой літаратуры.

А таму няхай усё ж выдаецца сто, а не трыццаць дзіцячых кніг за год. Тым больш, што попыт на дзіцячую кнігу яшчэ далёка не задаволены, што дзіцячая кніга — і ў гэтым нельга не згадзіцца з Б. Зубкоўскім — сапраўды чытаецца. Чытаюцца і кнігі нашых, беларускіх пісьменнікаў. Гэта могуць пацвердзіць настаўнікі, работнікі кнігагандлю, у гэтым вы можаце пераканацца самі.

...АБЛЕЗЛАЯ, абшарпаная шыльда пры ўездзе ў Клімавічы з боку Варшаўскай шашы. Яна абвяшчае аб тым, што ты трапляеш не абы-куды, а ў «г. Клімавічы». Яшчэ больш сціплая шыльдачка над дзвярыма састарэлай будыніны непадалёк ад цэнтра: тут знаходзіцца раённая дзіцячая бібліятэка. Насупраць бібліятэкі, у кватэры бацькоў, я абсталяваў мінулай зімой назіральны пункт. І няхай пазайздросцяць мне ўсе, хто піша для дзяцей, бо такога яны, мусіць, не чулі і не бачылі: увесь дзень снег рыпеў пад маім акном, увесь дзень дзверы бібліятэкі не зачыняліся. Так было і назаўтра, і праз тры дні, і праз тыдзень.

Я не чуў гаворкі, але бачыў твары юнакоў. На іх былі чаканне і надзея: чаканне сустрэчы і надзея, што яна будзе цікавай.

Я мог разгледзець знаёмыя вокладкі кніг... Дарэчы, тут мы падыходзім да першага «і інш»: вельмі многа сярод іх было такіх, што «праходзяць» у артыкуле Б. Зубкоўскага пад гэтым неакрэсленым індэксам.

На жаль, я не мог перанесціся на якія пятнаццаць год наперад, каб адтуль, з той вышыні, зірнуць на літаратуру нашых дзён. Але хачу верыць: многія з сённяшніх «і інш» стаялі б упоравень з тымі, каму пашанавала трапіць у спіс № 1.

Вось гэты спіс паводле Б. Зубкоўскага: Якуб Колас, Міхась Лынькоў, Янка Маўр, Алесь Якімовіч, Янка Брыль, Іван Шамякін, Тарас Хадкевіч, Іван Грамовіч, Сяргей Грахоўскі, Васіль Вітка, Эдзі Агняцвет, Віталій Вольскі. Кнігі памянёных таварышаў або «карыстаюцца нязменнай любоўю», або, на благі канец, іх «з ахвотай чытаюць нашы школьнікі». Не, аўтар не паставіў тут кропку, але спіс, мабыць, здаўся яму занадта доўгім, і ён паклікаў на дапамогу выратавальнае «і інш» — «многіх маладзейшых празаікаў і паэтаў».

«Ну і што,— скажаце вы,— няўжо трэба было пералічваць усіх гэтых «маладзейшых»?

Не, не трэба было, але адразу пасля «спісу № 1» Б. Зубкоўскі паўтарае даволі традыцыйную скаргу на тое, што «нашы старэйшыя майстры

[Заканчэнне на 3-й стар.].

У РАБОТНІКАЎ КНІЖНАГА ГАНДЛЮ

АБМЕНЬВАЮЦЦА ЛІТАРАТУРАЙ

Некалькі год назад работнікі Магілёўскага абл. кнігагандлю завязалі сувязі са сваімі суседзямі — Бранскай абласной кнігагандлёвай арганізацыяй. З таго часу з Магілёва ў Бранск і з Бранска ў Магілёў ідуць кантэйнеры з кнігамі. Працоўныя браншчыны з цікавасцю набываюць і чытаюць творы беларускіх празаікаў і паэтаў.

Асабліва пашырыліся гэтыя сувязі сёлета. Нядаўна ў Бранск адпраўлена вялікая партыя мастацкай літаратуры, якая выдадзена беларускімі выдавецтвамі. Калі магілёўчане даведаліся, што ў кнігарнях Бранска ёсць раман «Уваскрэсенне» Л. Талстога, папрасілі даслаць кнігу. Днямі атрымалі кантэйнер з Бранска. У ім — тысяча экземпляраў патрэбнага выдання.

Работнікі магілёўскіх кнігарань пераканаліся, што такія сувязі прыносяць вялікую карысць і яны пачалі пашыраць іх з іншымі абласнымі цэнтрамі братніх рэспублік. Наладжана сувязь са Смаленскім аблкнігагандлем. У Смаленск адпраўлены раманы «Сэрца на далоні» І. Шамякіна і «Сасна пры дарозе» І. Навуменкі. Са Смаленска атрымалі «Даведнік пчаляра», які карыстаецца вялікім попытам на Магілёўшчыне.

Кантэйнеры з мастацкай і музычнай літаратурай адпраўлены ў Кішынёў і Ульянаўск. Хутка і з гэтых гарадоў прыйдуць кнігі для працоўных вобласці.

НА ВЫШЫНІ 7 ТЫСЯЧ МЕТРАЎ

Цяжкі самалёт АН-10, на борце якога каля ста пасажыраў, узнімаецца ў паветра з Мінскага аэрапорта і бярэ курс на Сімферопаль. Да Крыма — дзве з паловай гадзіны палёту. На вышыні вельмі спокойна, і бортправадніца Алена Іванаўна Яглоўская прапануе кнігі. Яна — грамадскі распаўсюджвальнік літаратуры. За апошні час Яглоўская атрымала з кнігарні творы І. Шамякіна, Ул. Карпава, Я. Маўра, шмат брашур.

Мастацкую літаратуру прадаюць таксама на паветраных лініях Мінск — Свярдлоўск, Мінск — Масква, Мінск — Адлер. Абавязкі прадаўцоў добра выконваюць бортправадніцы З. Лямцава, С. Кісель, А. Скуратовіч, Н. Людыно і іншыя.

ГАРАДСКІ КІРМАШ

У Гомелі пачаў працаваць кірмаш, арганізаваны аблкнігагандлем і магазінамі прамгандлю. Работнікі кнігарань выставілі 12 латкоў, укамплектаваных палітычнай, мастацкай, навукова-тэхнічнай літаратурай. Наведвальніку кірмашу,— а іх было многа,— цікавіліся новымі творамі беларускіх пісьменнікаў. Значна павялічыўся попыт на музычную і дзіцячую літаратуру.

Кірмаш працягнецца да 4 ліпеня.

ЛЮБОЎ, ПРЫЗНАННЕ, УДЗЯЧНАСЦЬ

Народнаму паэту Беларусі, лаўрэату Ленінскай прэміі Петрусю Броўку споўнілася 60 гадоў. 25 чэрвеня ў памяшканні Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы адбыўся вечар, прысвечаны юбіляру.

У тэатр прыйшлі рабочыя і студэнты, калгаснікі і пісьменнікі, вучоныя і артысты. Апладысментамі сустрэлі яны з'яўленне юбіляра.

У прэзідыуме вечара — сакратар ЦК КПБ С. О. Прытыцкі, намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР Ул. Е. Лабанок, І. Ф. Клімаў, сакратар Мінскага абкома КПБ А. Ц. Караткевіч, сакратар Мінскага гаркома партыі В. Я. Лежапёкаў, госці з Масквы, Ленінграда, Рыгі, якія прыехалі павіншаваць юбіляра, пісьменнікі Міхась Лынькоў, Пятро Глебка, Іван Шамякін, прадстаўнікі творчых саюзаў Беларусі, многіх прадпрыемстваў і ўстаноў рэспублікі.

Адкрыў вечар народны пісьменнік Беларусі Кандрат Крапіва. Высока ацэньваючы творчую і грамадскую дзейнасць Петруся Броўкі, ён падкрэсліў заўсёдную блізкасць творчасці юбіляра да інтарэсаў і думак народа, да самага галоўнага і важнага ў нашым жыцці.

Прывітанне юбіляру ад Цэнтральнага Камітэта КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў рэспублікі зачытаў сакратар ЦК КПБ С. О. Прытыцкі.

Усхвалявана і прачула гаварыў пра Петруся Броўку — паэта, грамадскага дзеяча, чалавека — Сяргей Грахоўскі. Успамінамі пра сустрэчы з юбілярам на самым пачатку яго творчай дарогі падзяліўся зямляк паэта Тарас Хадкевіч.

А потым на беларускай і рускай мовах гучалі шматлікія віншаванні. Ад імя праўлення Саюза пісьменнікаў СССР да юбіляра з сяброўскім словам звярнуўся Георгій Маркаў. Віншаванні пісьменнікаў Расійскай Федэрацыі перадаў Анатоль Сафронаў. З прачулым словам любві да гераічнай беларускай зямлі і яе сына-паэта выступіў лаўрэат Ленінскай прэміі, ленінградзец Аляксандр Пракоф'еў. Ад самых блізкіх сяброў і паплечнікаў юбіляра — пісьменнікаў Беларусі — віншаванні перадаў Пятро Глебка. Ад пісьменнікаў братняй Латвіі Петруся Броўку вітаў Юлій Ванаг, ад рэдкалегіі «Праўды» — М. А. Абалкін, ад часопіса «Дружба народов» — пісьменніца, Герой Савецкага Саюза Ірына Леўчанка, ад часопіса «Москва» — яго рэдактар Яўген Папоўкін.

Юбіляра віншавалі таксама сакратар ЦК ЛКСМБ А. М. Ваніцкі, намеснік міністра культуры БССР Я. Б. Парватаў, намеснік міністра асветы БССР Р. І. Сярноў, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку Р. В. Канавалаў, рэктар БДУ А. Н. Сеўчанка, міністр будаўніцтва БССР, Герой Сацыялістычнай Працы І. М. Жыжаль, народныя мастакі рэспублікі І. О. Ахрэмчык і А. А. Бембель, прадстаўнікі Мінскага аўтазавода, камвольнага камбіната, фарфоравага завода, радыёзавода, шклозавода «Нёман», калгаса «Маяк камунізма» Барысаўскага раёна, Тэатра імя Янкі Купалы, выхаванцы Мінскага Палаца піянераў і іншыя.

Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Мікола Ткачоў зачытаў некаторыя са шматлікіх пісьмаў, тэлеграм, прывітальных адрасоў, якія прыйшлі да юбіляра з усіх куткоў нашай краіны. Віншаванні Петрусю Броўку прыслалі К. Т. Мазураў, Ш. Р. Рашыдаў, А. Ю. Снечкус, касманаўт Г. С. Цітоў. З Масквы юбіляра віталі Міхаіл Ісакоўскі і Мікалай Ціханаў, з Махачкалы — Расул Гамзатаў, з Рыгі — Ян Судрабкалн, з Вільнюса — Юстас Палецкіс, з Кіева — Паўло Тычына. З Вішанскай прыйшла тэлеграма ад Міхаіла Шолахава: «Дарагі Пятрусь! Не без злараднасці думаю, што нарэшце і ты дагнаў мяне. Карняйчук, ты і я — не такая ўжо благая ўсерасійская тройка. Ды ўтраіх і весялей аднагодкам цягнуць адзін воз. Моцна абдымаю, цалую, жадаю здароўя, бадзёрасці, поспехаў». Ад імя Саюза румынскіх пісьменнікаў павіншаваў юбіляра Поп Сімён, з Балгарыі прыйшла тэлеграма ад літаратуразнаўцы і перакладчыка Георгія Вылчава. Словы віншавання і найлепшага пажадання адрасавалі Петрусю Броўку саюзы пісьменнікаў братніх савецкіх рэспублік, рэдакцыі газет і часопісаў, калектывы навуковых і навучальных устаноў, прадпрыемстваў, калгасаў, партыйныя і савецкія работнікі, сябры-пісьменнікі.

Цёпла сустрэты прысутнімі на вечары выступіў Пятрусь Броўка. Ён падзякаваў за высокую ацэнку яго творчасці і грамадскай дзейнасці і запэўніў, што надалей усе свае сілы будзе аддаваць роднай зямлі, народу, вялікай справе пабудовы камунізма.

У заключэнне вечара творчы калектыў Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы паказаў «Паўлінку».

ПРЫСВЕЧАНА НАРОДНАМУ ПАЭТУ

Крычаўская гарадская бібліятэка сумесна з прафсаюзнай бібліятэкай цэментнага завода правялі літаратурны вечар, прысвечаны творчасці лаўрэата Ленінскай прэміі Пятра Броўкі.

З дакладам пра жыццёвы і творчы шлях паэта, яго грамадскую дзейнасць выступіў выкладчык беларускай літаратуры сярэдняй школы М. Давыдзенка. Вучаніцы сярэдняй школы Л. Пятрова, В. Краўчанка, Р. Галкіна, Л. Селядцова і іншыя прачыталі вершы паэта.

Напярэдадні вечара былі абсталяваны выстаўкі твораў П. Броўкі.

І. ЮРЧАНКА.

ПРАБЛЕМЫ ТЭАТРА

СПРАВЫ АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ— СПРАВЫ ТВОРЧЫЯ

Леанід ВАЛЧЭЦКІ,
дырэктар Брэсцкага тэатра імя ЛКСМБ.

Мне здаецца, артыкул А. Гантмана «...і складаная гаспадарка» («Літаратура і мастацтва» ад 21 мая) — добры пачатак для абмеркавання самых надзённых праблем жыцця нашага тэатра.

Перш за ўсё — пра падрыхтоўку дырэктараў тэатраў. Наколькі мне вядома, спецыяльнай падрыхтоўкай гэтых кадраў не займаюцца не толькі ў Беларусі. Арганізацыя ж курсаў па падрыхтоўцы дырэктараў тэатраў у нашай рэспубліцы з'явілася б пачаткам вырашэння досыць вострай праблемы.

Тое, што існуюць курсы па перападрыхтоўцы адміністрацыйных работнікаў тэатраў у Маскве і Ленінградзе, справы не вырашае. Бо ў нас жа, у Беларусі, мы мала ведаем пра перадавы арганізацыйны вопыт іншых тэатраў краіны, варымся ва ўласным саку.

Думаецца, не пашкодзіла б час ад часу праводзіць двух-трохтыднёвыя семінары дырэктараў тэатраў і іх намеснікаў. Могуць быць навят розныя варыянты міжрэспубліканскіх семінараў (напрыклад, Беларусі і прыбалтыйскіх рэспублік або Беларусі і Украіны). Пры гэтым, на маю думку, такі семінар трэба наладжваць у горадзе, дзе мясцовыя тэатры добра працуюць, дзе арганізатарская дзейнасць іх кіраўнікоў—на ўзроўні сённяшняга дня.

Я наўмысна пачынаю з «дробязей», бо наш клопат аб будучыні нашых тэатраў — неадрыўны ад узбагачэння нашага адміністрацыйнага вопыту.

У апошні час атрымалася так, што за ўсе беды ў тэатры — ці то невыкананне фінансавага плана, ці то выпуск непаўнацэнных спектакляў, нарэшце, нездавальняючы стан вытворчай дысцыпліны і выхаваўчай работы ў калектыве — перш за ўсё адказваюць дырэктары тэатраў. Мне ж здаецца, што і галоўныя рэжысёры таксама павінны цалкам падзяляць гэтую адказнасць. Эканоміка і маральна-палітычны стан творчага калектыву — агульны клопат дырэктара і галоўнага рэжысёра. Абгрунтоўваць гэтую думку няма патрэбы.

Цяпер жа, навошта грэх таіць, нашы рэжысёры і мастакі вельмі часта самаўхіляюцца ад гэтых пытанняў. А невыкананне фінансавага плана, перавыдаткаванне пастановачных сродкаў непасрэдна звязаны з работай рэжысёраў і мастакоў. Неабходна, вельмі неабходна, каб і яны навучыліся лічыць дзяржаўныя сродкі.

А. Гантман выказвае слушныя думкі аб адказнасці галоўных рэжысёраў як творчых і ідэйных кіраўнікоў за мастацкае аблічча тэатра і перш за ўсё — за яго рэпертуар. З гэтага патрабавання вынікае неабходнасць неяк спыніць бясконцую чахарду са зменамі галоўных рэжысёраў, якая адмоўна адбіваецца на развіцці тэатральнага мастацтва ў рэспубліцы.

Мне здаецца, даўно пара адмяніць сістэму камплектавання акцёрскіх і рэжысёрскіх кадраў тэатраў па конкурсах. Гэтая сістэма не апраўдала сябе. У нейкай меры такія конкурсы прымальныя для сталічных тэатраў. У тэатрах жа абласных яны не прыносяць жаданых вынікаў. Раней тэатральныя кіраўнікі выязджалі ў Маскву на так званую акцёрскую «біржу» і мелі магчымасць калі не ў спектаклях, дык хаця б асабіста пазнаёміцца з акцёрамі, пагутарыць з імі. А з увядзеннем конкурсаў мы пазбаўлены нават гэтай магчымасці.

Варта, на мой погляд, перайсці на сістэму дагавораў. Можна, напрыклад, вызначыць нейкі пэўны месяц у годзе (лепш за ўсё жнівень), калі тэатры заканчваюць сезон, і праз аддзел кадраў Міністэрства культуры СССР або праз спецыяльнае бюро па заключэнню дагавораў з творчымі работнікамі (прынцыпы стварэння такога бюро трэба добра абдумаць) арганізаваць у Маскве такія заключэнні дагавораў, дзе ў сур'ёзнай, дзелавой абстаноўцы маглі б сустрэцца кіраўнікі тэатраў і акцёры.

Далей. Больш сямі год мінула з часу апошняй усесаюзнай тарыфікацыі творчых работнікаў. Ужо даўно прайшлі ўсе тэрміны чарговай тарыфікацыі, і гэта выклікае ў калектывах пэўную нездаволенасць. Упарадкаванне заработнай платы тэхнічных і іншых груп работнікаў тэатраў прывяло да пэўнай неадпаведнасці ў аплаце працы акцёраў і некаторых работнікаў пастановачнай часткі. Так, напрыклад, малады акцёр, які скончыў тэатральны інстытут, прыйшоўшы ў тэатр, атрымлівае менш, чым старшы рэквізітар (уважлівы і добрасумленны работнік здольны асвоіць гэтую прафесію за месяц-паўтара). І яшчэ прыклад: загадчык пастановачнай часткі — пасада, якая патрабуе глыбокага ведання ўсёй тэхналогіі тэатральнай справы. А між тым, ён атрымлівае заработнай платы менш, чым начальнікі цэхаў. Цяжка працаваць без ліквідацыі гэтых супярэчнасцей.

Шмат недарэчнага бывае ў нас і ў час правядзення гастроляў — гэтага адказнага перыяду ў жыцці кожнага творчага калектыву. Штогод, напрыклад, ад тэатраў патрабуюць перад гастролямі скласці заяўкі, указаўшы гарады, дзе той ці іншы калектыў жадаў бы выступаць. Але як правіла заяўкі гэтыя не задавальняюцца. У выніку — паездка на выпадковыя пляцоўкі, бывае і на такія, дзе і будынак тэатра па колькасці месц і па рэпертуару, які можна там іграць, не забяспечваюць гастралюючаму тэатру выканання фінансавага плана.

Таму, на мой погляд, установам, якія плануюць гастролі тэатраў, неабходна заўсёды мець у сябе хоць бы такія дадзеныя: камерцыйная ўмяшчальнасць тэатральных пляцовак; падрабязныя дадзеныя аб умяшчальнасці і фінансавых магчымасцях выязных пляцовак, аб наяўнасці няштатных упаўнаважаных па арганізацыі гледача і, самае галоўнае, — аб рэпертуары, які іграўся на працягу хаця б апошніх трох год не толькі мясцовым тэатрам, але і гастралёрамі. Не ведучы такога ўліку, мы трацім шмат часу на высвятленне гэтых пытанняў. Часта абапіраемся толькі на памяць. Вось і прывозім на гастролі спектаклі, якія параўнальна нядаўна ўжо іграліся гастралёрамі. Вынік — напаўпустая зала.

Неабходна таксама абавязаць усе тэатры, каб яны давалі дакладныя звесткі аб сваіх памяшканнях і рэпертуары не толькі свайго тэатра, але і гастралёраў. У кожнага стацыянарнага тэатра павінны быць дублірапарцічкі гастралюючых тэатраў, якія б захоўваліся, прынамсі, на працягу трох год.

Павысіць адказнасць за правядзенне гастроляў не толькі саміх кіраўнікоў тэатраў, але і тых, хто займаецца планаваннем гастроляў — неадкладная задача.

Сёння выраслі ў творчых адносінах многія нашы абласныя тэатры. Яны маюць цікавы рэпертуар. Трэба хаця б зрэдку дабівацца для іх гастроляў у вялікіх гарадах Украіны, Расійскай Федэрацыі, Прыбалтыкі. Пакуль жа чамусьці для абласных тэатраў дарога туды закрыта. Яны з году ў год выязджаюць толькі ў невялікія гарады. А як бы абавязвала ў творчых адносінах паездка абласнога тэатра, напрыклад, у Ленінград або Горкі, у Вільнюс або Рыгу.

Амаль пяцьдзесят працэнтаў творчай дзейнасці тэатра — выязныя спектаклі. Нашы тэатральныя калектывы сталі напаўстацыянарнымі, напаўперасоўнымі.

Сёння, на маю думку, зусім устарэў такі парадак, калі аплата сутачных работнікам тэатраў, якія выязджаюць са спектаклямі ў раёны вобласці, даецца толькі ў выпадку іх вяртання назад пасля двух гадзін ночы. А між тым доўгая паездка ў аўтобусе, нярэдка па цяжкай дарозе, патрабуе вялікага напружання. Дык чаму ж гэтыя людзі павінны апынуцца ў горшым становішчы, чым звычайныя камандзіраваныя?

Больш таго — варта найхутчэй выпрацаваць палажэнне аб заахвочванні за выязныя спектаклі работнікаў тэатра, а не ўшчымляць іх інтарэсы.

Мне здаецца таксама няправільным абмежаванне работнікаў тэатра ў памерах сутачных у перыяд гастроляў. Звычайны ж камандзіровачны атрымлівае тры працэнты, выязджаючы ў камандзіроўку да трыццаці дзен. Калі, скажам, гэтага нельга зрабіць для ўсіх работнікаў тэатра, дык для групы з невысокай зарплатай—трэба.

Немалаважнае пытанне — стварэнне спецыяльных зручных аўтобусаў для перавозкі артыстаў (са зручнымі сядзеннямі, у якіх можна адпачываць), а таксама спецыяльных грузавых машын з павялічанымі кузавамі для перавозкі дэкарацый і спецыяльнай кабінай, дзе маглі б змясціцца тры-чатыры рабочыя сцэны. У маштабах рэспублікі, зразумела, вырашыць гэта цяжка. А вось паставіць пытанне перад Міністэрствам культуры СССР, а таксама перад прафсаюзам работнікаў культуры — неабходна.

Цяжка пагадзіцца з прапановай А. Гантмана аб увядзенні зніжаных расцэнак на «старыя» спектаклі. Цэны на білеты ў нашы тэатры — невысокія. Таму наўрад ці варта «уцэньваць» спектаклі з залатога фонду, як гэта робіцца з застарэлымі фасонамі паліто ці штаноў. Іншая справа — у суботнія і нядзельныя дні, магчыма, варта было б на 15—20 працэнтаў павышаць кошт білетаў, каб тым самым стварыць нейкую перавагу для гледачоў, якія наведваюць тэатр у рабочыя дні тыдня.

Многа мы гаворым аб паляпшэнні мастацкага афармлення нашых спектакляў, аб эканоміі пастановачных сродкаў. Але робім для гэтага мала. Часам трацім вялізныя сродкі на дарагія матэрыялы для касцюмаў і афармлення, бо са звычайных тэкстыльных баз вымушаны браць аднародны матэрыял цэлымі кіпамі, калі патрэбна ўсяго 3—5 метраў.

А рэклама? Яна ў нас часта друкуецца ледзь як не на абгортачнай паперы, бо добрай паперы нам не адпускаюць.

Гаспадарчыя і арганізацыйныя пытанні жыцця тэатральных калектываў патрабуюць уважлівага і глыбокага разгляду. І вельмі добра, што газета ўзняла іх. Справы арганізацыйныя — гэта таксама справы творчыя.

АКЦЁРЫ І РОЛІ

ДОБРАЙ ДАРОГІ, ПАЎЛІНКА!

КАЛІ ідзе «Паўлінка», у купалаўскім тэатры заўсёды свята. Нават не верыцца, што гэта хатка, утульная і зграбная, з карункамі разьбы і з імем Купалы па застрэшшу, з'явілася на свет у тым далёкім ліхалецці суровых дзён вайны, калі ў руінах ляжала Савецкая Беларусь. Стварыць такі на дзіва жыццялюбны, светлы, паўнагучны, сапраўды народны спектакль маглі людзі толькі з моцнай верай у невычэрпнасць сіл народа і з неперадольнай марай аб радасці і шчасці.

Ала Доўгая па ўзросце, напэўна, равесніца спектаклю. І калі нядаўна яна ўпершыню выйшла на сцэну ў ролі Паўлінкі, здавалася, што ў яе юнацкасці, напеўнасці і прамяністым поглядзе ўвасобілася ўсё тое, пра што марыўся людзям у нялёгкім сорак трэцім годзе. Ці не таму купалаўская хатка так гасцінна прыняла актрысу? Ці не таму ёй у спектаклі так лёгка спяваецца і любіцца? Смех — звонкі і задорны, сум — радасны, а шчасце— налітое, на поўную вагу, нібыта ў час саспелы плод.

Паўлінка Алы Доўгай у чымсьці вельмі сучасная, хаця яе аблічча зусім пасуе да дакастрычніцкае вёскі, рэчаіснасць якой адлюстраваў Янка Купала ў сваёй п'есе. Хутчэй за ўсё Паўлінку належыць, пэўна, называць не колішняй, не сённяшняй, а — «заўсёднай», бо ў ёй мы бачым увасабленне вечнага юнацтва, скіраванага заўсёды наперад, у будучыню.

Свабодны яе нораў і светлы розум. І колькі б ні палохаў бацька, мы верым, што не быць Паўлінцы за надзьмутым і нікчэмным шляхціцам Быкоўскім. Пачуццё свабоды, незалежнасці ў яе натуры — ад самой прыроды, як у птушкі — інстынкт палёту, як у песні — гук, у вясёлцы—адценні, пераліва фарбаў. Ёсць у Паўлінцы—Доўгай тая глыбокая сапраўднасць характару народнага, беларускага, нацыянальнага, якую не перадасі ў словах. І ёсць адметная купалаўская паэтычнасць.

Што можна яшчэ дадаць? Якім наказам трэба блаславіць актрысу-дэбютантку, што прыйшла на акадэмічную сцэну па конкурсу, які быў аб'яўлены спецыяльна на гэтую ролю?

Пэўна ж, не ўсё ў ігры Алы Доўгай адразу і настолькі ідэальна, каб не знайсці заганаў. Ёсць у першых сцэнах залішняя нервознасць, ёсць сям-там і недакладнасць мовы («з'ядаюцца» канцоўкі фраз). Ды толькі ад такой бяды праз пяць ці шэсць паказаў Ала, відаць, пазбавіцца, набудзе той унутраны спакой, які прыносіць радасць творчасці і захапленне.

Наказам — найкаштоўнейшым! — для маладой актрысы будзе сцэнічнае жыццё не партнёраў. На кожным новым паказе спектакля іх бачыш нібыта ўпершыню. Здавалася б, усё вядома: як Альжбета (народная артыстка СССР Л. Ржэцкая) будзе ўлагоджваць свайго наравістага мужа, як Сцяпан (народны артыст БССР Ул. Дзядзюшка) марна будзе зычыць Паўлінцы надзьмутага і фанабэрыстага жаніха, як іх свацця Агата Пустарэвіч, з засяроджанасцю пайшоўшы ў сконі, ніяк не зладзіць з зухаватым рытмам «Лявоніхі», — і ўсё ж кожная хвіліна ігры артыстаў ўспрымаецца як штосьці нечаканае, што нараджаецца вось зараз, тут, імправізацыйна.

Ала Доўгая ўвайшла ў гэты бліскучы і зладжаны ансамбль удала і натуральна. З яе прыходам «Паўлінка» стала больш грацыёзнай, маладзейшай, больш прамяністай, звонкай. Няхай жа гэта маладосць захоўваецца так доўга, свежа і змястоўна, як было ў першай выканаўцы гэтай ролі — народнай артысткі БССР Р. Кашэльнікавай. І хай пры гэтым да маладой артысткі як найхутчэй прыходзіць сталасць сцэнічнага майстэрства.

Добрай дарогі, Паўлінка!

Георгій КОЛАС.

На здымку — А. ДОЎГАЯ ў ролі Паўлінкі.

Фота Ул. КРУКА.

НА ТЭМЫ МАРАЛІ

У СПАВАЖНАЙ ІНСТЫТУЦКАЙ ЦІШЫНІ

Усё пачалося быццам з дробязі. Мясцком Мінскага педагагічнага інстытута размяркоўваў кватэры. Члены МК і прарэктар Мікалай Іванавіч Гурскі прапанавалі выдзеліць асобную кватэру Жакавым—мужу і жонцы, кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам, якія ўжо шмат гадоў працуюць у інстытуце.

З такім рашэннем не пагаджаўся толькі рэктар І. Е. Лакін. У гэтую кватэру ён хацеў пасяліць М. Я. Лянсу, які працаваў у інстытуце першы год. Тым больш, што за Міхаіла Якаўлевіча Лянсу непакоілася і нервавалася яго сястра Алена Якаўлеўна Лянсу—вельмі паважаны ў інстытуце выкладчык. Але кватэру аддалі ўсё-такі Жакавым. І адсюль пачынаецца траянская бітва, пра якую пойдзе наша гаворка. Бо Алена Якаўлеўна яшчэ доўга бедавала—маўляў, адабралі кватэру ў брата. І затаіла на Жакавых крыўду...

Гэта, так сказаць, пралог. А цяпер—першая дзея.

У красавіку мінулага года на філасофскім семінары, якім кіруе Алена Якаўлеўна Лянсу, Зінаіда Іванаўна Жакава выступіла з дакладам на тэму «Некаторыя назіранні над мовай і стылем работы Ул. І. Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Даклад зацікавіў удзельнікаў семінара і атрымаў станоўчую ацэнку.

Зацікавіў даклад і кіраўніка семінара. Але трошкі не так, як таварышаў, што шчыра павіншавалі Зінаіду Іванаўну. Назаўтра ж пасля семінара А. Я. Лянсу паслала ў Маскоўскую дзяржаўную бібліятэку імя Ул. І. Леніна просьбу выслаць ёй бібліяграфію работ, блізкіх па тэме да даклада Жакавай. Даведку прыслалі з бібліятэкі даволі доўгую. Каб толькі перачытаць названыя работы, спатрэбілася б шмат часу, а яго ў А. Я. Лянсу было небагата—яна пісала доктарскую дысертацыю. Ды хіба можна браць пад увагу нейкую там работу над дысертацыяй, калі трэба шукаць матэрыялы, якія скампраметавалі б Жакаву! Алена Якаўлеўна засела за скрупулёзнае вывучэнне пералічаных бібліятэкай работ. Глыбокія навуковыя даследаванні не далі вынікаў—фактаў плагіяту ў дакладзе Жакавай выявіць не ўдалося.

Але тут пачынаецца дзея другая. Пачынаецца ў тыя харошыя для Жакавай дні, калі камуністы літаратурна-музычнага факультэта аднагалосна прынялі яе кандыдатам у члены КПСС. Галасавала за прыём Зінаіды Іванаўны ў партыю і Алена Якаўлеўна. Як на сходзе камуністаў факультэта, так і на пасяджэнні партбюро інстытута. Ды потым яна даведваецца, што колішні добры друг Зінаіды Іванаўны прарэктар і загадчык кафедры, дзе Жакава працуе, Мікалай Іванавіч Гурскі змяніў добразычлівасць у адносінах да Жакавай на насцярожанасць. І што ён і яго вучні—члены кафедры—выступаюць супраць прыёму Жакавай у партыю. І вось Алену Якаўлеўну не пазнаць. Нібыта гэта не яна, а нехта іншы двойчы падымаў сваю руку за Жакаву!

Лянсу (яна была тады членам партыйнага бюро інстытута) дамаглася адмены рашэння аб прыёме Жакавай у партыю. Па гэтаму пытанню было склікана паўторнае пасяджэнне партбюро. На яго запрошаны былі некаторыя члены кафедры рускай мовы на чале са сваім загадчыкам і яны ўжо пастараліся паказаць свайго калегу як найгорш. Сцвярджалі, напрыклад, што грамадскай работай Зінаіда Іванаўна пачала займацца толькі перад уступленнем у партыю і што вядзе яе для паказу. (Між тым, Жакава ўжо некалькі год куратар студэнцкай групы, у яе не адна ганаровая грамата «за актыўны ўдзел у прафсаюзнай рабоце», «за распаўсюджанне палітычных і навуковых ведаў сярод насельніцтва» і г. д.). Член кафедры Я. Хмялеўская настойліва пераконвала партбюро, што Жакава «ўступае ў партыю з кар'ерысцкіх меркаванняў».

Невядома па чыёй віне ў пратаколе пасяджэння партбюро былі дапушчаны істотныя памылкі. Камуніст А. Саладуха, напрыклад, рэкамендаваў прыняць Жакаву ў партыю і на пасяджэнні партбюро даў ёй станоўчую характарыстыку. Нейчая ж рука запісала ў пратаколе, што А. Саладуха ад сваёй рэкамендацыі нібыта адмовіўся.

Не вельмі разабраўшыся, члены партбюро інстытута ўстрымаліся ад прыёму Жакавай у партыю—маўляў, хай іх ліха з гэтымі звадкамі, можа самі якнебудзь паміж сабой паміраццa... І на гэтым, будзем лічыць, апускаецца заслона другой дзеі.

Адкрываецца яна зноў тады, калі новы склад партыйнага бюро пытанне аб прыёме З. І. Жакавай у партыю вынес на абмеркаванне агульнага інстытуцкага партыйнага сходу. На гэтым сходзе стала зразумела, што супраць Жакавай выступаюць у асноўным... аўтары дапаможніка «Русский язык», які Зінаіда Іванаўна рэзка крытыкавала. Праўда, М. Гурскі сцвярджаў, што ён сапсаваў адносіны з Зінаідай Іванаўнай не з прычыны таго, што яна ганіла дапаможнік, аўтарам і рэдактарам якога ён з'яўляецца, а значна раней, яшчэ да выхаду кнігі ў свет. Аднак прафесар, мусіць, памыліўся ці проста змяніў, бо кніга выдадзена ў 1962 годзе, а ў студзені 1963 года ён падараваў экземпляр кнігі Жакавай і падпісаў: «Глыбокапаважанай Зінаідзе Іванаўне ў знак дружбы».

Што датычыцца выступлення А. Я. Лянсу, то скажам проста—яно было крывадушным. Пачала яна з таго, што ёй, бачыце, не хацелася б гаварыць пра адмоўнае ў характары Зінаіды Іванаўны, бо на сходзе прысутнічаюць камуністы-студэнты і яны могуць страціць павагу да Жакавай, як да выкладчыцы. Зразумела, такая заява Алены Якаўлеўны насцярожыла студэнтаў-камуністаў, нават абразіла іх. Выходзіла, што для камуністаў-студэнтаў і камуністаў-выкладчыкаў існуюць дзве праўды, і з першымі трэба размаўляць у адной аўдыторыі, а з другімі—у другой. Супраць гэтага камуністы запратэставалі.

Супраць неабгрунтаваных абвінавачванняў Жакавай выступілі камуністы А. І. Саладуха, А. І. Бабчынскі, А. І. Воранава, А. І. Чарткоў і іншыя. Яны зазначылі, што Зінаіда Іванаўна высокакваліфікаваны спецыяліст, які карыстаецца павагай і аўтарытэтам сярод выкладчыкаў і студэнтаў. Добрае слова было сказана і пра чалавечыя рысы Жакавай, хоць, вядома, не абышлося і без крытыкі. Жакавай гаварылі, прынамсі, што ёй не хапае часам стрыманасці, што тады-сяды і яна вінавата ў абвастрэнні адносін на кафедры і г. д. Але добразычлівасць гэтай крытыкі даказваецца ўжо тым, што дзевяноста працэнтаў камуністаў прагаласавалі за прыняцце Жакавай у партыю.

І падыходзіць чацвёртая дзея—так сказаць, кульмінацыйная. Алена Якаўлеўна, Мікалай Іванавіч і іх аднадумцы, быццам па камандзе пішуць на Жакаву заявы ў райком партыі. Ды якія заявы і колькі! Прарэктар даводзіць, што Жакава «стварае групоўкі». Яна здольна на «хлусню і інтрыганцтва», дапаўняе А. Лянсу. Яна «зняважае, ганьбіць» перад студэнтамі паважаных таварышаў, яна «нагаворшчыца», дадае Я. Хмялеўская і г. д. і т. п.

Чытач, магчыма, падумае, што гэтыя цяжкія абвінавачванні пацверджаны фактамі. Дзе вы бачылі—прыхільніца Гурскага А. Н. Навумовіч проста так і піша, што фактаў няма, але «яна адчувае іх».

Камісія Ленінскага раённага камітэта партыі разгледзела гэтыя заявы і прызнала іх бяздоказнымі, неабгрунтаванымі.

Бюро райкома партыі прыняло Зінаіду Іванаўну кандыдатам у члены КПСС. Камуністы інстытута з задавальненнем сустрэлі такое рашэнне.

Здавалася, усё стала на месца. Ды толькі здавалася. У Мікалая Іванавіча паспеў новы план дзеяння «з пазіцыі сілы». З кніжных паліц былі зняты друкаваныя работы Жакавай, якія выйшлі ў свет 5—6 гадоў таму назад. Па метаду А. Я. Лянсу ў іх пачалі шукаць плагіят.

Праўда, Мікалай Іванавіч як-ніяк прафесар і разумее, што проста лабавая атака ў гэтым выпадку небяспечная—кожны прасцяк можа спытаць: чаму ж ніхто не бачыў плагіяту ў работах Жакавай пяць гадоў назад? Чым выклікана цікавасць да гэтых работ цяпер? Таму было аб'яўлена, што на пасяджэнні кафедры адбудзецца абмеркаванне ўсё таго ж дапаможніка «Русский язык». Зінаідзе Іванаўне прапанавалі прадставіць свае заўвагі ў пісьмовай форме. Але варта было Жакавай гэтыя заўвагі прачытаць, як уся кафедра, з лёгкай рукі самога загадчыка, забылася, якое пытанне стаіць на парадку дня пасяджэння. Не дапаможнік «Русский язык» і яго недахопы сталі прадметам абгаварэння, а дацэнт Жакава і напісаныя ёю калісь работы. Ды якога абгаварэння—суда! Прафесар Гурскі так разышоўся, што забыўся і пра тактоўнасць, і пра чыннасць. Чаго толькі не пачулі ад яго і членаў кафедры Зінаіда Іванаўна, а, заадно і прадстаўнікі райкома партыі, якія прысутнічалі на пасяджэнні...

Пакуль што на гэтым падзеі і закончыліся. Як разгорнуцца яны далей—пакажа час. Хоць шчыра кажучы, лепей было б, каб яны не разгортваліся, а згарнуліся. Канчаткова і назаўжды. Бо неяк няёмка гаварыць людзям, што выхоўваюць выхавацеляў, людзям вунь як дасведчаным у пытаннях маралі, чым патыхае ад усёй гэтай прыкрай гісторыі...

А энергію, што вызваліцца ў выніку сканчэння баталіі, далібог жа, з большай карысцю можна пусціць на мірныя навуковыя і навучальныя мэты.

А. КІЕНЯ.

ПРЕМ'ЕРА КУПАЛАЎЦАЎ

У мінулую суботу Беларускі акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы паказаў новы спектакль «Яшчэ раз пра каханне» па п'есе Э. Радзінскага (пераклад А. Вольскага). У спектаклі заняты артысты Г. Талкачова, А. Мілаванаў, М. Федароўскі, Л. Федароўская, Ю. Шумакоў, П. Пекур, Г. Аўсяннікаў і іншыя. Рэжысёр — дыпламант Ленінградскага дзяржаўнага інстытута тэатра, музыкі і кінематаграфіі Б. Ганага, мастак — А. Грагар'янц.

На здымку — у ролі Еўдакімава — А. Мілаванаў, Наташы — Г. Талкачова.

МАСТАЦКАЯ СТАЛАСЦЬ

Узорнаму аркестру штаба Беларускай ваеннай акругі споўнілася пятнаццаць гадоў. Гэты калектыў ваенных музыкантаў належыць да ліку найбольш цікавых мастацкіх ансамбляў Беларусі. Ён праводзіць вялікую работу па прапагандзе музычнай культуры не толькі сярод воінаў акругі, але і ў клубах прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і навучальных устаноў. Творчы калектыў — неад'емны і актыўны ўдзельнік вайсковых парадаў, святочных дэманстрацый працоўных Мінска і розных народных урачыстасцей.

Аркестр штаба БВА карыстаецца ў нашай грамадскасці павагай і прызнаннем, дзякуючы сваёй мастацкай сталасці і накопленаму за гэтыя гады надзвычай багатаму і разнастайнаму рэпертуару. Апрача так званай ваенна-прыкладной, страявой музыкі, аркестр выконвае лепшыя творы рускіх і заходніх кампазітараў-класікаў, амаль усе буйныя п'есы, напісаныя савецкімі аўтарамі ў жанры духавой музыкі, а таксама пераладжанні сучасных сімфанічных і эстрадных твораў. Ваенныя музыканты — сапраўдныя прапагандысты і творчасці нашых беларускіх кампазітараў.

Але не толькі багаты рэпертуар і творчая актыўнасць вызначаюць мастацкае аблічча штабнога аркестра. Гэта — сапраўды ўзорны ансамбль музыкантаў, якія валодаюць выдатным музычным строем, цудоўным «піяна» і паўнагучным, без грукату «фортэ». Кожная аркестравая група з выключнай гнуткасцю пераймае тэмы твора адна ад адной. Здзіўляюча мякка акампаніруе аркестр салістам. І таму, відаць, невыпадкова так ахвотна выступаюць з гэтым калектывам народныя артысты СССР Т. Ніжнікава і Н. Ткачэнка, народныя артысты БССР Л. Галушкіна, Л. Бражнік, В. Чарнабаеў, заслужаная артыстка БССР Е. Эфрон і іншыя нашы выдатныя спевакі і інструменталісты.

Я ўжо шмат гадоў назіраю за творчай дзейнасцю аркестра штаба БВА, слухаў многія яго канцэртныя праграмы, добра ведаю творчыя магчымасці калектыву і яго кіраўнікоў. Нядаўна мне давялося пазнаёміцца з новай праграмай, якую аркестр падрыхтаваў да свайго 15-годдзя, і з якой ён зараз выступае перад воінамі Беларускай ваеннай акругі і грамадскасцю рэспублікі.

У канцэртах аркестрам дырыжыруюць па чарзе падпалкоўнік Б. Пянчук, маёр А. Майзлер і капітан І. Зарэцкі. Гэта вопытныя музыканты, кожны з уласным творчым почыркам, перакананаўчай дырыжорскай тэхнікай; кожны па-свойму падыходзіць да прачытання аўтарскай партытуры. Б. Пянчук імкнецца да мяккасці гуку, пластычнасці формы. Яму неўласцівы яркія, гукавыя і тэмпавыя кантрасты. Паўнагучна і ўпэўнена выконвае аркестр пад кіраўніцтвам Б. Пянчука вядомы фанфарны марш «Слава Радзіме» С. Чарнецкага, ярка і выразна, блізка да задумы А. Барадзіна — абаяльны жаночы танец з «Палавецкіх скокаў» («Князь Ігар»). Імкненне гэтага дырыжора да інструментальнага «спявання» добра відаць ў «Аве Марыі» Ф. Шуберта, якая выконваецца ансамблем трубачоў у суправаджэнні аркестра. У той жа час неяк камерна, без палымянасці дырыжыруе Б. Пянчук мужчынскім танцам у «Палавецкіх скоках». Магчыма большай кантраснасці патрабуе выкладанне абодвух тэм-вобразаў у паэме «Шчорс» А. Бабоўскага (наогул нецікавым творы).

Для дырыжора І. Зарэцкага характэрныя рытмічная дакладнасць, імкненне да яркасці кантрастаў пры дырыжыраванні музычнымі творамі. Але яму іншы раз не хапае плаўнасці ў пераходах ад адных дынамічных або тэмпавых адценняў да другіх. У яго трактоўцы ўпэўнена гучыць, напрыклад, марш у фінале Пятай сімфоніі П. Чайкоўскага, на адным дыханні выконваецца «Тарантэла» В. Мільдэ ў пераладжанні для фагота з духавым аркестрам самога дырыжора (саліст Ю. Кавальскі) і «Скерцо для трубы» А. Арацюняна (саліст Г. Дыментаў). А вось іншыя творы, скажам, эпізоды ў фінале сімфоніі Чайкоўскага і «Хабанера» з балета Я. Глебава «Мара», дзе больш патрабуецца гнуткасці, плаўнасці нюансаў, — пакідаюць у слухача меншае ўражанне.

А. Майзлер з усіх трох музычных кіраўнікоў аркестра — найбольш гарманічны ў раскрыцці свайго дырыжорскага майстэрства. Ён актыўна імпульсіўны ў сваіх мастацкіх намаганнях, але разам з тым і пластычны, добра вытрымлівае рытм і тэмп музыкі, досыць пругка карыстаецца іх адценнямі. І таму так мякка, задуменна выконвае аркестр пад кіраўніцтвам А. Майзлера першую частку Канцэрта для валторны з аркестрам Р. Штраўса (саліст і аўтар пераладжэння Ю. Бінбулатаў), пашучна і напорыста — эпізод «Набат» з Адзінаццатай сімфоніі «1905 год» Д. Шастаковіча.

Кожная новая сустрэча з духавым аркестрам штаба БВА прыносіць аматарам мастацтва многа радасці і эстэтычнага задавальнення.

І. НІСНЕВІЧ.

ДЗЕСЬЦІ ПОБАЧ З ІСТОТНЫМ

«МАЯ ДАЧКА» М. ГАРУЛЁВА У ГОМЕЛЬСКІМ ТЭАТРЫ

У рэпертуар сваёй сёлетняй творчай справаздачы перад грамадскасцю Мінска Гомельскі абласны драматычны тэатр уключыў новую п'есу Міколы Гарулёва «Мая дачка». Зварот гэтага тэатральнага калектыву да п'есы беларускага аўтара трэба, вядома, усяляк вітаць, тым больш, што не ўсе тэатры рэспублікі ставілі перад сабой у мінулым сезоне падобную задачу.

Сувязь са «сваім» аўтарам, нараджэнне спектакля па новай п'есе заўсёды актывізуюць дзейнасць творчага калектыву, робяць жыццё тэатра больш інтэнсіўным, уносяць у яго атмасферу пошукаў. У працэсе ўзаемнай разведкі жыццёвага матэрыялу, узятага аўтарам, узаемнай работы драматычны твор звычайна ўзбагачаецца, паглыбляецца яго змест.

На жаль, калі знаёмішся з п'есай і спектаклем «Мая дачка», ствараецца ўражанне, што тэатр і, перш за ўсё, рэжысёр Ф. Шчарбакова сур'ёзна, глыбока з аўтарам не папрацавалі. Інакш можна было б, відаць, унікнуць некаторых хібаў, што ляжаць на самай паверхні твора.

Хочацца адразу падкрэсліць: у п'есе «Мая дачка» ёсць пэўныя вартасці. Ёсць некалькі ўдала выпісаных сцэн, зробленых лёгка, з адчуваннем гумару.

Камедыйнае пачуццё, якім валодае аўтар, дазволіла яму стварыць такія абаяльныя вобразы, як прафорг Таня, печкалёп Якаў, пенсіянерка Кузьмінічна. Трапныя фарбы знойдзены М. Гарулёвым для старога рабочага Сцяпана Кандакова. Прывабны вобраз і жонкі Сцяпана Ганны Дзмітраўны.

Асобныя сцэны сведчаць пра тое, што аўтару ўдаецца дыялог, у якім мы ўспрымаем падтэкст слоў, самы ход, дынаміку думак герояў.

Разам з тым і ў п'есе, і ў спектаклі многае не ўспрымаецца як жыццёвая праўда, многае не пераконвае. І хочацца разабрацца, асэнсаваць, у чым карэнні недахопаў, у якім напрамку пошукаў можна было б «падняць» п'есу, а разам з ёй і пастаноўку. Адказы тут, вядома, могуць быць спрэчнымі. Аднак, ніяк не лічачы свае думкі ісцінай у апошняй інстанцыі, паспрабую выказаць заўвагі па п'есе і спектаклю.

Патомны рабочы, стары ліцейшчык Сцяпан Кандакоў хацеў бачыць сваю прыёмную дачку Ніну прадаўжальніцай яго справы, інжынерам-металургам. Пра гэта ж некалі марыў сябра Кандакова, бацька Ніны, які загінуў на фронце. І раптам, зусім нечакана Сцяпан Кандакоў даведваецца: дачка ўжо не студэнтка. Напярэдадні вясновых экзаменаў Ніна паехала з інжынерам Сізовым на Рыжскае ўзбярэжжа, а вярнуўшыся ў Ленінград, апынулася па-за сценамі інстытута.

Загінула мара Сцяпана Кандакова. Ён цяжка перажывае ўчынак Ніны, а калі стала вядома, што дачка вырашыла зноў паехаць у Ленінград вучыцца, ён падумаў, што яна «вяртаецца на правільную лінію жыцця».

Уход Ніны з інстытута і яе вяртанне ў Ленінград становіцца сюжэтнай спружынай п'есы. І вось задумваешся: а ці дастаткова значная яна—гэта цэнтральная падзея п'есы, якой выкліканы перажыванні герояў, сутыкненні, барацьба? Справа ж, нарэшце, не ў тым, ці будзе маладая гераіня інжынерам-металургам. За гэтым павінна было вырастаць нешта большае. І яно, напэўна, з'явілася б, калі б у п'есе быў матэрыял з такой вось нагрузкай. Бацькі Ніны марылі ўбачыць дачку наследніцай сваіх поглядаў, жыццёвай маралі, чалавекам, які прыме іх праўду. Але, скажам, яна на нейкім этапе адступілася ад іх веры, жыццёвых пазіцый, пайшла па іншаму, чужому ім шляху. Тады мы сапраўды спачувалі б Кандакову, разам з ім адчувалі б гэта, як глыбокае гора. І калі б барацьба блізкіх людзей, жыццё прывялі Ніну да праўды бацькоў, калі б яна прыняла іх ісціны, іх маральныя каштоўнасці — мы разам з дзеючымі асобамі радаваліся б таму, што Ніна «вяртаецца на правільную лінію жыцця».

Нельга сказаць, што ў аўтара няма пэўных пошукаў у гэтым напрамку. Аднак, яны існуюць у п'есе толькі як намёк, выразнага ўвасаблення яны не атрымалі. І гэта збядняе тэму «дачка-пераемніца», збядняе ідэйны сэнс п'есы, вызначаны ў загалоўку. На маю думку, матыў аб тым, што Ніна дачка прыёмная ў гэтай п'есе лішні, непатрэбны, ён дзесьці нараджае фальшывыя сітуацыі.

Ёсць у п'есе недахопы, якія выкліканы недастатковай псіхалагічнай распрацоўкай вобразаў.

Тое, што Ніна раптам пакінула інстытут, аўтар матывуе моцным каханнем. Што ж, такое, безумоўна магчыма. Але калі так, ці можа Ніна пасля некалькіх рэплік Сізова, у якіх раскрываецца яго эгаізм, яго пункт погляду на прызначэнне жанчыны ў грамадстве,— так лёгка, без пакут, без роздуму адмовіцца ад свайго кахання, прыняць рашэнне аб разрыве з Сізовым.

А вось сцэна ўходу дачкі Кандакова з сям'і. У размовах, якія папярэднічаюць гэтай падзеі — няма развіцця таго ўнутранага стану герояў, які мог бы прывесці да рэзкіх слоў Кандакова і Ніны, да яе ўходу.

Адчуванне няпраўды, відавочна, часам узнікае і ад таго, што ва ўзаемаадносінах Ніны і Сізова мы не бачым сапраўднага кахання. Мала яго ў літаратурным матэрыяле? Так, мала. Але тут на дапамогу мог прыйсці рэжысёр, выканаўцы роляў Ніны і Сізова. Яны маглі і павінны былі ўзбагаціць тэкст унутраным жыццём, другімі планамі, дэталямі і штрыхамі з арсеналу акцёрскіх сродкаў выразнасці. Ёсць адна ўдалая сцэна ў Л. Дымавай, якая іграе Ніну і адна сцэна ў М. Пало — выканаўцы ролі Сізова.

Раптам зажыла Ніна—Дымава ў сцэне з Таняй, калі Ніна спрабуе разабрацца ў Сізове, у яго паводзінах, у яго каханні. Тут заўважаеш і псіхалагічную дакладнасць і пэўную чалавечнасць. Але такіх сцэн, на жаль, больш няма. І няхай бы не гаварыліся словы пра каханне — як многа маглі б сказаць вочы Ніны — Дымавай, калі б у іх свяцілася сапраўднае пачуццё.

Тое ж, па сутнасці, датычыцца і Пало—Сізова. З'явілася ж чалавечная сцэна ў фінале, калі Пало—Сізоў паяўляецца ў доме Ніны, якая збіраецца ў дарогу. Змог жа знайсці акцёр пераканаўчы псіхалагічны малюнак вобраза, каб прыадчыніць душу героя, які церпіць паражэнне. Чаму ж акцёр не знайшоў нічога падобнага на працягу ўсяго спектакля? Да фіналу ж не было ніводнай сцэны, у якой артыст пайшоў бы далей аўтарскага тэксту, узбагаціў бы яго сваім дыханнем, пачуццём.

У гэтых адносінах многа зроблена заслужаным артыстам рэспублікі М. Цурбаковым, які выконвае ролю старога рабочага-ліцейшчыка. Аўтар змог надзяліць Кандакова рысамі, якія робяць яго жывым чалавекам. Мы верым яго гарачай нястомнасці, жаданню заставацца на пасту грамадзяніна, які сэрцам, думкамі сваімі заўсёды з родным заводам, з цэхам, з рабочым калектывам. І калі б бацькоўскія матывы, бацькоўская драма былі раскрыты гэтак жа пераканаўча, — вобраз Сцяпана Кандакова стаў бы больш паўнакроўным, багацейшым.

М. Цурбакову аказаліся бліжэй грамадзянскія рысы характару героя. Што ж датычыць драмы бацькі, то тут таленавітаму акцёру не хапае псіхалагічнай напоўненасці. Не выглядае, на жаль, верагоднай смерць Кандакова. Яна не падрыхтавана і таму не робіць эмацыянальнага ўздзеяння.

Нельга не адзначыць просты і вельмі чалавечны малюнак, знойдзены заслужанай артысткай рэспублікі Л. Гамулінай для ўвасаблення вобраза Ганны Дзмітраўны.

Удала знойдзенымі камедыйнымі фарбамі, шчырасцю адзначаны ў спектаклі Кузьмінічна (артыстка Н. Карнеева), Якаў (артыст В. Ткачэнка) і асабліва Таня ў выкананні Г. Кузьміной. Таня—Кузьміна так і ззяе весялосцю, сцвярджэннем жыцця, непадробным, усёперамагаючым аптымізмам.

Невыпадкова з такой зацікаўленасцю сустракае глядач з'яўленне Тані—Кузьміной на сцэнічнай пляцоўцы.

У заключэнне хочацца сказаць: у п'есе «Мая дачка» ёсць недахопы, але ёсць і такое, што выклікае цікавасць глядзельнай залы. Гэта сведчыць, што ў п'есе, у яе драматургічных сітуацыях ёсць тое, што блізка кожнаму чалавеку. Узаемаадносіны бацькоў і дзяцей, грамадскія і сямейныя інтарэсы жанчыны, эгаізм і душэўная шчодрасць у каханні і працы — усё гэта не можа не хваляваць людзей.

Але ўзнімаючы і вырашаючы такія праблемы, аўтар, на жаль, не пранік у глыбіні жыцця, не здолеў так раскрыць тэму, каб мы, гледачы, сталі багацейшымі ўнутрана, інтэлектуальна і маральна. Гэта ў многім залежала ад драматурга.

А. ГУТКОВІЧ.

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

ДЫК У ЧЫМ ЖА СПРАВА?

Настаўнік Слуцкай завочнай сярэдняй школы, няштатны школьны бібліятэкар Рыгор Родчанка прыслаў у рэдакцыю нашай газеты трывожнае пісьмо. Пачыналася яно так: «На жыццё школьнай літаратурнай хрэстаматыі зроблены замах. Усё пачалося з таго, што нехта выказаў правільную па сутнасці думку: пры вывучэнні літаратуры ў школе трэба карыстацца не скарочанымі хрэстаматыйнымі варыянтамі, а паўнацэннымі творамі. І вось вам вынік: хрэстаматыі па рускай і беларускай літаратурах у апошнія гады не перавыдаюцца».

Далей Р. Родчанка слушна заўважае: «Няма гаворкі: вывучаць творчасць таго ці іншага пісьменніка лепш за ўсё па зборніках яго твораў, а яшчэ лепш па акадэмічнаму выданню. Але жыццё ёсць жыццё і трэба ўлічваць яго патрабаванні. Думка, што ў сучасны момант літаратура ў школе павінна вывучацца толькі па зборніках твораў пісьменнікаў, ёсць, мякка кажучы, пражэкцёрства. Ці можа сёння кожная школьная бібліятэка мець дастатковую колькасць праграмных твораў, каб задаволіць патрабаванні вучняў? Пэўна ж, не можа!

У нашай школе, напрыклад, два дзесятыя класы, па 35 вучняў у кожным. Каб задаволіць іх патрабаванні на «Вайну і мір» Л. Талстога, школьнай бібліятэцы трэба мець 140 тамоў гэтага твора. Акрамя гэтага, трэба было б мець дзесяткі тамоў Л. Талстога для пазакласнага чытання. А школ—тысячы! Каб хоць больш-менш забяспечыць іх толькі праграмнымі творамі, патрэбны мільёны кніг рускіх і беларускіх пісьменнікаў. Каб выдаць неадкладна гэтую колькасць кніг, спатрэбяцца мільёны і мільёны рублёў».

Што ж рабіць? Р. Родчанка прапануе: «Трэба выдаваць школьныя хрэстаматыі. Хрэстаматыя—зручная і патрэбная кніга. У ёй звычайна даюцца як праграмныя творы, так і творы для пазакласнага чытання. Праўда, вялікія па аб'ёму рэчы даюцца ў скарочаным выглядзе. У гэтым істотны недахоп хрэстаматыі. І ўсё ж, маючы хрэстаматыю, вучань прачытае хоць скарочаны варыянт таго ці іншага твора. А сёння, пры адсутнасці хрэстаматыі і асобных выданняў праграмных твораў, ён часта зусім іх не чытае і ведае літаратуру «па слыху», па крытыцы. Думаецца, што лепш мець пад рукамі хоць скарочаны варыянт твора, чым не мець нічога».

Пісьмо сваё Р. Родчанка заканчваў такімі словамі:

«Нашы выдавецтвы павінны выдаць да пачатку новага навучальнага года дастатковую колькасць хрэстаматый, бо без іх пакуль што нельга абысціся. Інтарэсы школы патрабуюць затрымаць руку, якая замахнулася на жыццё хрэстаматыі. Паміраць ёй яшчэ ранавата».

Пісьмо Р. Родчанкі не адзінкавае. Аб лёсе школьнай хрэстаматыі пісалі ўжо настаўнікі з розных школ рэспублікі. І ўсе яны сцвярджаюць, што пакуль што без хрэстаматыі нельга абысціся. Больш таго, асобныя таварышы гавораць, што і ўвогуле, нават пры наяўнасці ў школьных бібліятэках патрэбнай колькасці праграмнай і пазакласнай літаратуры, хрэстаматыя ўсё роўна мае права на жыццё.

У чым жа справа? Чаму тады спынена яе выданне?

І вось я па даручэнню рэдакцыі знаёмлю з пісьмом настаўніка Р. Родчанкі таварышаў з Міністэрства асветы рэспублікі, выдавецтва «Народная асвета», іншыя кампетэнтныя арганізацыі, каб высветліць іх думку па гэтаму пытанню.

Галоўны рэдактар выдавецтва «Народная асвета» Н. Лапіцкая, прачытаўшы першыя радкі пісьма настаўніка Р. Родчанкі, сказала:

— Усё ясна. Аўтар за хрэстаматыю. Як і многія іншыя. Нам гэтыя патрабаванні настаўнікаў вядомыя. Не так даўно гэта ж самае гаварылі нам настаўнікі—выкладчыкі беларускай мовы і літаратуры, што былі ў Мінску на курсах у Інстытуце ўдасканалення. І што вам сказаць? Мы можам толькі паспачуваць гэтым таварышам, а дапамагчы...—І Ніна Фёдараўна разводзіць рукамі.—Хрэстаматыі выдаваць мы не маем права. Іх выданне быццам бы спынена па ўсёй краіне. Ведаю дакладна, што ў Расійскай Федэрацыі хрэстаматыі не выдаюцца.

— А ў астатніх рэспубліках?

— Не магу пэўна сказаць. Можа, дзе-небудзь і выдаюцца, а можа і не.

— Даруйце, Ніна Фёдараўна, як вы думаеце, умовы аднолькавыя ў Беларусі і ў РСФСР?

— Вядома ж не. Там амаль усе праграмныя творы па рускай літаратуры выдаваліся і шмат разоў перавыдаваліся сотнямі тысяч экземпляраў. І таму трэба ці, прынамсі, можна думаць, што большасць школ за многа гадоў маглі ўкамплектаваць свае бібліятэкі патрэбнай літаратурай. У нас жа становішча зусім іншае. У нас тыражы нават класікаў рэдка перавышаюць 10 тысяч экземпляраў—па аднаму на школу не прыпадзе. Таму я і кажу, што нам зразумелая заклапочанасць настаўнікаў аб лёсе хрэстаматыі. Чым мы можам іх заспакоіць? Пяць гадоў ішла гаворка аб тым, каб замест хрэстаматыі выдаваць школьную серыю праграмных і пазакласных твораў. Але выданне хрэстаматый было спынена ў 1961 годзе, а пытанне аб школьнай серыі ўсё дзесьці дыскутавалася. Аж пяць гадоў! Цяжка было нават вырашыць і тое, каму выдаваць гэтую школьную серыю: нам ці выдавецтву «Беларусь». І вось толькі сёлета справа кранулася з месца: запланавана выдаць 33 назвы праграмных твораў і твораў для пазакласнага чытання беларускай літаратуры. У будучым годзе мы выдадзім першыя 8 назваў кніг. Вось, калі ласка, план: дарэвалюцыйная беларуская літаратура, драматычныя творы Янкі Купалы, «На ростанях» Якуба Коласа, «Трэцяе пакаленне» Кузьмы Чорнага, драматычныя творы Кандрата Крапівы, апавяданні Міхася Лынькова, вершы і паэмы Петруся Броўкі, вершы і паэмы Аркадзя Куляшова.

—Значыць, выданне ўсёй серыі з трыццаці трох кніг расцягнецца на 3—4 гады?

— Так, на тры-чатыры, а можа і пяць гадоў. За адзін год выдаць усё немагчыма.

— Значыць, і яшчэ тры-чатыры-пяць гадоў школы будуць адчуваць вострую патрэбу ў хрэстаматыі?

— Відавочна. Яшчэ тры-чатыры гады будуць тыя ж цяжкасці, што і апошнія чатыры-пяць гадоў. — Ніна Фёдараўна памаўчала і дадала: — Ды, шчыра кажучы, і выданне ўсіх трыццаці трох назваў наўрад ці ліквідуе гэтыя цяжкасці. Дапусцім нават, што кніжкі гэтай серыі трапяць у кожную васьмігадовую і сярэднюю школы (што, дарэчы, можна будзе зрабіць толькі ў строга цэнтралізаваным парадку), дык і то на школу прыпадзе іх па 3—4—5 экземпляраў. Ну, няхай сабе па дзесяць. Усё роўна гэтага яўна мала, каб зусім адмовіцца ад хрэстаматыі. Вось што я магу сказаць. Карацей—мы за хрэстаматыю. Яна сапраўды патрэбна школе.

З вучоным сакратаром Навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР Ул. Андрэенкам я гутарыў па тэлефоне. Пачуўшы, аб чым ідзе гаворка, ён узрушана загаварыў:

— Вельмі добра будзе, калі газета падтрымае гэтыя прапановы і патрабаванні настаўнікаў. Мы таксама лічым, што хрэстаматыя патрэбна школе, нават неабходна. Магчыма нават, што яе ніколі не заменіць школьная серыя твораў нашай літаратуры. Урэшце рэшт, адно другому не пашкодзіць. Школьная серыя таксама патрэбная рэч, але як каштоўны—больш поўны, больш вычарпальны—дадатак да хрэстаматыі. Так і робяць, напрыклад, нашы суседзі-ўкраінцы: поруч са школьнай серыяй яны выдаюць і хрэстаматыю.

Метадыст Міністэрства асветы БССР Ул. Вярбіла таксама падтрымаў прапанову аб выданні хрэстаматый:

— Я мяркую, што ад хрэстаматыі адмаўляцца не трэба. І не толькі сёння, але і ўвогуле. Хрэстаматыя—падручнік. А як жа можа школа абысціся без падручніка? Серыя кніг «Школьная бібліятэка» — гэта, калі можна так сказаць, раскоша, а хрэстаматыя—хлеб надзённы для вучня. Праўда, тут трэба адзначыць, што дамагацца перавыдання тых хрэстаматый, якія былі ў нас, няварта. Ранейшыя хрэстаматыі былі недасканалыя—не хрэстаматыі, не падручнікі для школы, а бяздумныя зборнікі тэкстаў. Трэба падшукаць людзей, якія добра ведаюць літаратуру і маюць вопыт педагагічнай работы і даручыць ім скласці новыя хрэстаматыі з улікам сённяшніх патрабаванняў да выкладання ў школе літаратуры.

Апошняе маё інтэрв'ю было з міністрам асветы рэспублікі Р. Кісялёвым.

— Рыгор Якаўлевіч, якая ваша думка наконт выдання школьных хрэстаматый?

— Хрэстаматыі, як вядома, не апраўдалі сябе і ад іх адмовіліся. Адмовіліся па ўсёй краіне. Наша рэспубліка не можа быць выключэннем.

— Даруйце, але вось жа суседзі нашы, украінцы выдаюць...

—Не можа быць. Цікава, цікава. Абавязкова трэба навесці даведкі: ці праўда гэта, якога аб'ёму, якога характару, хто аўтары.—І Рыгор Якаўлевіч тут жа, па тэлефоне, аддаў распараджэнне пазваніць ці напісаць у Кіеў.—А замест хрэстаматый мы пачнём у 1965-66 навучальным годзе выдаваць школьную серыю праграмных і твораў для пазакласнага чытання па беларускай літаратуры.

Рыгор Якаўлевіч расказаў мне пра тое, пра што ўжо гаварыла галоўны рэдактар выдавецтва «Народная асвета».

Я задаў міністру апошняе пытанне:

— Рыгор Якаўлевіч, а якая ваша асабістая думка наконт хрэстаматыі? Як вы лічыце: патрэбна яна ці не?

— Я сам за хрэстаматыю. Нават прапаноўваў скласці яе і перакласці на рускую мову—для школ з рускай мовай навучання. І гаварыў аб гэтым, і пісаў.

— Дык, даруйце, у чым жа тады справа?

Яснага адказу на гэтае пытанне я не атрымаў. Яно, як кажуць, засталося адкрытым.

М. ГІЛЕВІЧ.

Дваццаць чатыры гады таму назад, у такія ж самыя гарачыя чэрвеньскія дні мужныя абаронцы Брэсцкай крэпасці вялі нероўны бой з фашысцкімі ордамі. Слава аб іх подзвігу жыве ў народзе. Нездарма ж так многа наведвальнікаў штодня бывае ў Музеі абароны Брэсцкай крэпасці. Вось і на гэтым здымку В. Васільева вы бачыце калгаснікаў сельгасарцелі «Савецкая Беларусь» Брэсцкага раёна ля экспанатаў музея.

НОВЫЯ ЭКСПАНАТЫ МУЗЕЯ

За апошнія месяцы фонды Кобрынскага музея імя Суворава папоўніліся вялікай колькасцю разнастайных экспанатаў, з якіх многія маюць надзвычайную цікавасць.

З маскоўскіх музеяў атрыманы партрэты XVIII ст., сцяг аднаго з суворaўскіх палкоў, баявыя ордэны, старыя лубачныя малюнкі і інш. Вельмі цікавы арыгінальны праект помніка А. В. Суворaву работы вядомага скульптара Вучэціча, атрыманы з Ленінграда.

Днямі з горада на Няве прыбылі экспанаты, перададзеныя Вышэйшым мастацка-прамысловым вучылішчам імя Мухінай. Асаблівай каштоўнасцю з'яўляюцца рэдкія ўзоры старажытнай мэблі, упрыгожанай мастацкай разьбой, а таксама шматлікія рэчы быту XVIII стагоддзя.

Апроч таго, сярод атрыманых экспанатаў ёсць некалькі скульптур і шмат разнастайных рэчаў, якія характарызуюць розныя віды прыкладнога мастацтва.

А. МАРТЫНАЎ.

ШТО ЗАСТАЛОСЯ ПА-ЗА СПІСАМ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

слова ў апошні час пішуць для дзяцей вельмі І вельмі мала». Сапраўды, мала, і ад гэтага, вядома, траціць дзіцячая літаратура, але прадбачу такія «далікатныя» фармуліроўкі: «Прапанаваць Івану Шамякіну...» або «Прасіць Тараса Хадкевіча...» Зразумела, было б вельмі добра, каб Іван Шамякін напісаў цікавую аповесць для дзяцей, а Аркадзь Куляшоў — паэму, а Андрэй Макаёнак—п'есу, а Тарас Хадкевіч ажыццявіў бы нарэшце сваю даўнюю задуму — напісаў кніжку, якая ў адным з выдавецкіх планаў называлася яшчэ «Падарожжа ў МТС». Было б вельмі добра. Але няхай гэта будзе натуральна, без прымусу, як напісалася калісьці ў «дарослай» польскай паэтэсы Марыі Канапніцкай абаяльная кніжка «Пра гномаў і сіротку Марысю».

І ўрэшце справа не ў гэтым. «Старэйшыя» пішуць вельмі і вельмі мала, маладзейшым адводзіцца месца толькі ў спісах № 2 і № 3, у першым з якіх змешчаны творы «ілюстрацыйныя, дыдактычныя, павярхоўныя», дзе «выгаворваюцца ў лоб маралізатарскія думкі», а ў другім — дакументальныя аповесці на ваенную тэму, напісаныя «пасрэдна, шаблонна, на нізкім мастацкім узроўні». А што ж тады застаецца? Дзённік Галіны Дакутовіч «Сэрца і крылы» (падрыхтоўка да друку Ул. Мехава) ды кніжка вершаў Васіля Зуёнка «Вясёлы калаўрот»? Толькі для гэтых дзвюх кніжак і знайшоў Б. Зубкоўскі добрыя словы.

Я вельмі шаную ўсіх пісьменнікаў, якія пералічаны ў спісе № 1, але не толькі яны складаюць нашу сённяшнюю дзіцячую літаратуру. Памятаю, той жа Алесь Якімовіч на нядаўнім сходзе дзіцячай секцыі гаварыў, што зараз яе нельга ўявіць без Васіля Хомчанкі, Эдуарда Карпачова, Хведара Жычкі. І яшчэ ён назваў некалькі прозвішчаў.

Старэйшыя — аплот нашай дзіцячай літаратуры, настаўнікі моладзі, але найбольш шматлікі яе атрад—тыя, што выдалі першыя кніжкі пяць—дзесяць гадоў назад і зараз стала працуюць для дзяцей. Калі ўспомніць усё лепшае, што імі зроблена, дык, мабыць, некаторыя сцвярджэнні Б. Зубкоўскага будуць усё ж перабольшваннем.

Ад няхітрых апавяданняў-фельетонаў праз адзначаныя гумарам і элементамі прыгодніцтва маленькія школьныя аповесці прыйшоў да такой цікавай і значнай кнігі, як аповесць «Зброю бяруць сыны» Хведар Жычка. Некалькі зборнікаў празрыстых, зусім пазбаўленых дыдактычнасці, дакладна адрасаваных апавяданняў выдаў Васіль Хомчанка. А апавяданні і аповесці Яўгена Курто, Міколы Ваданосава, Міхася Герчыка! А вершы Артура Вольскага, Івана Муравейкі!

Сталы прафесіяналізм, добры густ, высокая пісьменніцкая культура ўласцівы многім і многім дзіцячым кніжкам маладых аўтараў.

Але, каб не станавіцца на шлях пераліку, вернемся да жанру «адкрытага пісьма».

АХВОТНА падзяляю думку Б. Зубкоўскага, што кніга пра герояў—піянераў і камсамольцаў — павінна заняць у нашай дзіцячай літаратуры належнае месца і што тут яшчэ шмат можна і трэба зрабіць.

Мінулым летам мне давялося разам з былым партызанам-падрыўніком Героем Савецкага Саюза Уладзімірам Парахневічам зрабіць паездку па Бабруйшчыне — па мясцінах, дзе ён партызаніў. У адным месцы, на беразе рачулкі Ола, Уладзімір Аляксеевіч прыгадаў: вось тут яны ўдвух з сябрам у няроўным баі знішчылі групу фашыстаў з суседняга гарнізона. Ён пачаў расказваць, як гэта было. Мясцовы хлапчук год чатырнаццаці круціўся побач, прыслухоўваўся да нашай размовы, а потым пераканана, амаль са злосцю сказаў:

— Гер-рой!.. А пра тое не падумалі, што немцы праз вас маглі вёску спаліць...

Дзе і калі нападаць, каб не паставіць пад удар мірнае насельніцтва, — гэта вядома, было складанае пытанне партызанскай тактыкі — і вырашалася яно кожны раз канкрэтна. Дарэчы, гэтая вёска ўцалела. Але мяне ўразіла іншае: дзеці бяруць пад сумненне подзвіг бацькоў. Значыць, нечага вельмі важнага не здолелі ім сказаць старэйшыя, у тым ліку і пісьменнікі. Значыць, трэба зноў і зноў вяртацца да герояў Айчыннай вайны, аб чым і піша Б. Зубкоўскі.

Аднак з той ацэнкай, якую ён дае дакументальным аповесцям пра юных герояў Айчыннай вайны, наўрад ці можна згадзіцца.

«Маланка ў начы» Г. Васілеўскай, «Віця Сітніца» М. Корзуна, «На правым флангу» І. Сіняўскага, «У разведку ішоў хлапчук» В. Марозава, «Мы будзем жыць» В. Сіманавай — не настолькі гэта аднолькавыя кнігі, каб іх можна было паставіць у дужкі і ўсе разам прыраўняць да нуля. Тым больш, што пры ўсіх сваіх недахопах яны адыгралі і доўга яшчэ будуць адыгрываць вялікую выхаваўчую ролю.

І таму не ганіць агулам трэба гэтыя кнігі, а павесці пра іх дзелавую, творчую гаворку, назваць усё, што ёсць у іх дадатнага і адмоўнага. Гэта прынясе карысць нават у тым выпадку, калі з цягам часу яны застануцца толькі матэрыялам для больш смелых мастацкіх абагульненняў.

Далей Б. Зубкоўскі піша: «Увогуле дакументальны жанр чамусьці занядбаны ў нашай літаратуры».

Як бы не так! Хутчэй адбываецца нешта адваротнае: дакументалістыка ў апошнія гады прыкметна пацясніла «чыстую» прозу і невядома яшчэ, ці пойдзе гэта на карысць справе. Але аб некаторых здабытках мы можам гаварыць.

Цікавую справу робіць С. Александровіч, збіраючы дакументальныя матэрыялы і біяграфічныя звесткі пра дзіцячыя гады нашых выдатных пісьменнікаў. Яго кніга пра дзяцінства Якуба Коласа «Ад роднае зямлі...» абяцае вырасці ў вялікі і вельмі патрэбны біяграфічны твор. А творы ж, якія расказваюць пра фармаванне асобы пісьменніка, з якіх паўстае яго прывабнае чалавечае і грамадзянскае аблічча, надзвычай карысныя — яны вучаць дзяцей любві і павазе да літаратуры.

А, скажам, аповесці Ул. Мехава «Сцяг над рэўкомам» і «Апошняя яўка» — хіба ў іх не знойдзена дакладная прапорцыя паміж дакументальнай праўдай і мастацкім домыслам?

Можна ўспомніць яшчэ папулярную аповесць Я. Курто пра Юрку Сасноўскага — «Ён быў піянерам», апавяданні пра Леніна Васіля Хомчанкі, але паставім кропку, каб зноў не збіцца на пералік.

САПРАЎДЫ, кепскія ў нас справы з прыгодніцкай літаратурай. Няма новага Янкі Маўра, няма новых «Палескіх рабінзонаў». І ўсё ж не магу абысціся без аднаго «але». Пісьменнікам, якія сёння працуюць у прыгодніцкім жанры,—М. Гамолку, М. Ваданосаву, А. Шашкову—і вельмі пашанцавала, і наадварот. Пашанцавала, бо яны маюць такога добрага настаўніка, як Янка Маўр, і не пашанцавала, бо мы міжволі параўноўваем іх творы з «Палескімі рабінзонамі», з «Сынам вады» і «Амокам». Нялёгка ім даводзіцца!

Між тым аповесць Міколы Ваданосава «Апошні вадзянік» ужо сведчыць аб пэўным кроку пісьменніка наперад. Даволі, праўда, трывіяльныя прыгоды ў ёй адбываюцца на вельмі маляўнічым фоне беларускага пейзажу, яна наскрозь прасякнута нацыянальным каларытам. А гэта ўжо добра.

Застаецца ўздыхнуць і пагадзіцца, калі чытаеш сумныя радкі Б. Зубкоўскага пра навуковую фантастыку, пра драматургію для дзяцей, для школьнай сцэны. Тое ж самае трэба сказаць і пра гумар у дзіцячых кнігах. Сапраўды, нельга не парадавацца выхаду ў свет невялічкага зборніка вясёлых вершаў В. Зуёнка.

А вось што датычыць сцвярджэння, быццам «у нас няма па сутнасці кніг пра школу, пра жыццё і вучобу школьнікаў», дык яно зноў жа патрабуе агаворак.

Ёсць, напэўна, у школьнай тэме штосьці такое, што прымушае пісьменнікаў абыходзіць яе, пераносіць дзеянне з класа хоць у пекла (Янка Маўр), абы не апісваць гэтых чатырох сцен, класнай дошкі, стала настаўніка. Можа, тут дае знаць не пазбаўленае сэнсу меркаванне, што дзеці і без таго амаль круглы год па шэсць, калі не болей, гадзін праводзяць у класе.

Так ці інакш, але школьнай (у вузкім значэнні слова) тэмы доўгі час цураліся не толькі беларускія пісьменнікі. І ўсё ж мы маем некалькі цікавых кніг пра школу. Гэта, напрыклад, зборнік маленькіх, але дасціпных фельетонаў В. Высоцкага «Сябры-прыяцелі», аповесці Хв. Жычкі «Піфагоравы штаны», М. Ваданосава «Хатабыч-малодшы», М. Герчыка «Партрэт Фідэля».

КАНЧАЮЧЫ на гэтым сваё «адкрытае пісьмо», прызнаюся: мне хацелася весці гаворку пра што-небудзь больш канкрэтнае і акрэсленае—скажам, пра тыя ж дакументальныя аповесці на ваенную тэму. Але атрымалася так, што я вымушаны быў шмат у чым дапоўніць «папярэдняга прамоўцу» і міжволі сам следам за ім апынуўся ў палоне практычных праблем і агульных ацэнак. Што ж, калі гэтыя нататкі дадуць чытачу больш поўнае і аб'ектыўнае ўяўленне аб сённяшнім стане нашай дзіцячай літаратуры, мне не давядзецца шкадаваць.

І апошняе: няхай усе, каму знайшлося месца ў спісе № 1, даруюць мне маленькую несправядлівасць — я, вядома, больш клапаціўся пра тых, хто застаўся па-за спісам.

ГАВОРКА АБ СУЧАСНАЙ ПАЭЗІІ

Камсамольцы і моладзь аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР нядаўна запрасілі да сябе беларускіх пісьменнікаў Р. Барадуліна і Ул. Караткевіча. Госці прачыталі свае вершы, пазнаёмілі з творчымі планамі. Свае творы чыталі таксама малады паэт з Брэстчыны М. Купрэеў. У заключэнне адбылася цікавая гаворка. Думкамі аб сучасным стане беларускай паэзіі падзяліліся Ул. Гніламёдаў, В. Каваленка, В. Гапава, М. Біч, А. Ралько і іншыя. Прысутныя вырашылі ў бліжэйшы час правесці абмеркаванне рамана Ул. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім».

«ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ» НА БЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ

Студыя Беларускага тэлебачання прыступіла да работы над тэлевізійным спектаклем «Людзі на балоце» па раману І. Мележа. Гэта першая спроба пастаноўкі шматсерыйнага спектакля. «Людзі на балоце» будуць паказаны на блакітным экране ў трох серыях. Днямі мастацкі савет студыі абмеркаваў сцэнарый 1-й серыі і зацвердзіў склад выканаўцаў. У новай рабоце Беларускага тэлебачання будуць заняты вядучыя артысты Акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы — народныя артысты БССР С. Станюта, З. Стома, М. Бялінская, Б. Шаціла, Р. Кашэльнікава, Ул. Дзядзюшка, заслужаныя артысты рэспублікі В. Тарасаў, Г. Макарава, М. Яроменка і артысты Г. Гарбук, Л. Давідовіч, і іншыя. Інсцэніроўку рамана рыхтуе Э. Герасімовіч.

Пастаноўку спектакля ажыццяўляюць рэжысёр А. Гутковіч, галоўны аператар Ул. Пранько, мастак В. Казлоў і рэдактар Р. Александровіч. Пачаты кіназдымкі асобных сцэн спектакля, якія вядуцца ў раёне Бярэзінскага запаведніка.

Адбыўся шаснаццаты выпуск акцёрскага факультэта Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Мастацкі кіраўнік курса— прафесар народны артыст БССР Д. Арлоў. Студэнты-выпускнікі паказалі дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі дыпломныя спектаклі «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага, «Вера Харужая» А. Звонава (фрагменты), «Беласнежка і сем гномаў» Л. Усцінава і А. Табакова, «Старонкі дзённіка» А. Карнейчука, «У адкрытым моры» І. Мрожэка.

Сёлета інстытут выпусціў 21 акцёра, якія накіроўваюцца на працу ў тэатры рэспублікі.

На здымку — сцэна са спектакля «Вера Харужая». У ролі Веры Харужай — студэнтка З. Ліневіч, Агаты — студэнтка З. Іванова.

М. ШУМАЎ

ТУТ БЫЛІ НАШЫ АКОПЫ

УРЫВАК З АПОВЕСЦІ

Героі аповесці, над якой я цяпер працую, — настаўнікі, людзі, якіх я вельмі добра ведаю хоць бы таму, што сам шмат гадоў працую ў школе. Дзеянне адбываецца ў нашы дні, але, як гэта здараецца і ў жыцці, і сёння, праз шмат гадоў, да герояў аповесці нібы вяртаецца часам незабыўнае ваеннае мінулае. Адзін з іх прыязджае ў родны горад, дзе не быў амаль з часу вайны, і ў памяці яго ажываюць падзеі, пра якія расказваецца ва ўрыўку, што прапануецца чытачам.

АЎТАР.

КАЛІСЬЦІ гэта быў мой родны горад, і я ведаў у ім кожны дом, кожную дзірку ў плоце і, бадай, палову ўсіх жыхароў, дармо што іх было тысяч восемдзесят. І мяне, здаецца, таксама ведалі. Мяне, Кузю і Віцьку. Не ўсе, вядома, але не было такога гаспадара саду, які б не пракляў нас тройчы і на векі вякоў. Проста жах, колькі мы тады маглі з'есці яблык! Цяпер і за год столькі не адолею, колькі тады за які дзень...

Калісьці гэта быў родны горад, і неяк недарэчна і сумна адчуваць сябе цяпер турыстам, на кожным кроку пытацца, што, дзе і як. Новыя вуліцы, новыя дамы... і ніводнага знаёмага твару. Нават парк на старажытным гарадскім валу не той: ніводнай старой ліпы, нейкія незнаёмыя павільёнчыкі і альтанкі, а на месцы фантана з пазалочанаю жабай пасярэдзіне — летні тэатр. Ля гэтага фантана мы пахавалі Віцьку і яшчэ некалькі хлопцаў з нашай студэнцкай роты. У той самы, апошні дзень, роўна дваццаць тры гады назад.

... Акопчык наш — ля самай сцяны, над кручай. А ўнізе цячэ Дубравенка, за ёй — базарная плошча, а трошкі правей, на гары, Кузін дом. Адтуль б'юць немцы. А мы б'ём туды.

Ціха. Папыхваючы цыгаркаю, ляжу на дне і ляніва сачу, як Кузя няньчыцца са сваім кулямётам. Я — другі нумар, мой клопот — набіваць патронамі дыскі ды падаваць іх Кузю.

На другім баку парку, ля Дняпра, узнялася нервова-шалёная страляніна, і нехта блізка надрыўна загаласіў:

— Гэй, хто ёсць, усе сюды! Гансы на мост лезуць!

Эх ты, пасада другога нумара! Сваёй вінтоўкі і падсумкаў мала, цягні яшчэ дзве скрынкі з дыскамі, прадзірайся з занятымі рукамі праз гэтыя праклятыя зараснікі акацыі!

... Рэдкі ланцужок байцоў і апалчэнцаў з вінтоўкамі, наганамі, маўзерамі — хто з чым; аднекуль справа ліхаманкава строчыць «максім»; белабрысы сяржант у казацкіх штанах з лампасамі махнуў нам рукою, паказаў налева і пракрычаў нешта, а што — мы так і не разабралі.

... Над высачэннай каланчой ратушы рудаватае воблачка — яе ўвесь час клююць спарады, — а з воблачка вогненным пратуберанцам выплеснула агромністае палотнішча сцяга і трапяткім трывожна-вясёлым святлом заліло ўсё навокал.

— На Пешаходку спускайцеся! На Пешаходку! — крычыць нам забінтаваны чыгуначнік.

З кустоў выскачыў нейкі палкоўнік. Бяжыць уздоўж траншэі, махае аўтаматам, крычыць: «Багатыры! Бі немца! Багатыры!»

Кузя чамусьці смяецца і ніяк не можа ўставіць дыск. А па мосце бягуць, спатыкаюцца і зноў бягуць шэра-зялёныя фігуркі. Многа фігурак.

Набліжаюцца да брукоўкі... Бягуць па бруку... З-за піўнога ларка, што ўнізе, ля самай Пешаходкі, насустрач им ірвануўся хударлявы хлапчук у клятчатай каўбойцы і шпурнуў прама пад ногі чорны мячык «лімонкі». Граната не паспела яшчэ ўзарвацца, а пярэдні немец, рослы, з закасанымі рукавамі, з ходу ўсадзіў у грудзі хлапчука шырокі бліскучы штык.

— Віцька! — ахнуў я. — Віцька Цвік!

Шчоўкнуў устаўлены дыск, затросся, урэшце, і наш «дзягцяр», захліпаючыся ад злосці, пырскаючы пасінелымі гільзамі!.

— А-а, шакалы! — крычыць Кузя. — Ш-шакалы! Не падабаецца?! Шакалы... Дыск давай!

— Ствол спаліш, дай астыць!

— Хутчэй!.. Ну!

Даўно ўжо не варушыцца ніводзін з тых, каму пашанцавала перабегчы мост, а Кузя ўпарта пасылае туды, у кучу трупаў, чаргу за чаргой...

Цішыня, незвычайная цішыня. Зноў набіты дыскі, зноў Кузя спакойна ляжыць ля кулямёта.

— Эх, паспяшаўся Віцька, — уздыхае ён. — Я б іх і так зрэзаў!

— Як ён яго пырнуў, гадзюка!.. А можа, не зусім, а? Кузь, можа, не зусім?

Кузя маўчыць. І курыць. Потым знімае сваю каску і перавальваецца цераз невысокі бруствер...

Вось і ларок, той самы. Прыціснуўшыся да сценкі, асцярожна выглядаю — ніхто не страляе.

Кузя незнарок прываліўся да дзвярэй і раптам са страшэнным грукатам сіганув у сярэдзіну ларка.

Ніхто не страляе.

— Грышка, хадзі сюды! — чуецца, як з бочкі, яго шэпт. — Ах, чорт.

Ен ссе разадраны цвіком палец і глядзіць у малюсенькае акенца.

— Вунь, справа... бачыш? Пад немцам Віцька ляжыць... буцы вунь тырчаць...

Цяпер і я бачу чырвоную буцу, паўпрыкрытую светлым чубам забітага немца.

Немец вялізны, цяжкі, ледзь адцягнулі. Падхапілі сухенькае цела Віцькі і — бягом пад лесвіцу, у шырокую канаву, прамытую дажджамі.

...У кустах пачуліся галасы, нехта спускаўся да нас па гары.

— О! Ось воны дзе! — грымнула над галавою. — Толькі палюбуйцеся, таварыш старшы палітрук, на оцых ваяк! Кулямёт кінулі, самі ў цяньку вылежваюцца, на радасцях, што з дзесятак немцаў ухлопалі! Бяда мэні з гэтымі сцюдэнтамі! Камандзір прыйшоў, устаць!

Мы нехаця падняліся.

— А той спыць, чы шо?

— Спіць, — буркнуў Кузя. — Зусім... спіць.

— А, ну тады звіняйце, хлопцы, — сумеўся старшына. — Дружок?

— Ага... Штыком яго немец...

— Штыко-ом? — з павагай перапытаў старшына. — Так цэ він з гранатай кідаўся?.. Ну так, і сарочка ў клетку... А вы, значыць, выцягнулі яго адтуль? Не абстралялі вас? Не?

Старшына і палітрук пераглянуліся. Палітрук ледзь прыкметна кіўнуў галавой.

— Так, значыцца... Хто з вас першы нумар ля кулямёта? Ты, хлопча? Ось што: бяжы да свайго кулямёта, і падыміся трошкі вышэй, шчоб той бераг Дняпра на прыцэле трымаць можна було. І глядзі, не спаць! А мы з тваім карашком на мост підэма, гансаў памацаем. Дакументы патрэбны, паперы ўсялякія, ясна?

— А як жа... Віцька? — нерашуча запытаў Кузя.

— Я распараджуся, — адказаў палітрук. — Там, наверсе, яшчэ некалькі чалавек забіта. Пахаваем у брацкай магіле, як мае быць. А скончыцца вайна, помнік ім паставім! Тут жа, у парку. Каб ведалі людзі, хто ім адваяваў гэты парк! Ну, не трацце часу.

— Ёсць! — казырнуў старшына. — За мной!

...Адны на плошчы, сярод лужын крыві і мёртвых цел. Ледзь стрымліваючы млоснасць, у нейкім тумане наспех выварочваючы кішэні аднаго, другога, трэцяга... А потым наверсе, у сваім акопчыку, доўга маўчу, заплюшчыўшы вочы, маўчу, не звяртаючы ўвагі на штуршкі і лаянку пакрыўджанага Кузі.

Ужо далёка за паўдня, страшэнна смаліць сонца. На вылінялым небе ні хмурынкі. Цішыня, толькі ашалела трашчаць конікі. Нырнуць бы зараз вунь там, каля лёдарэза... Страляніны няма, але з акопаў ніхто не вылазіць, сядзяць ціха, аблізваючы засмяглыя вусны і да болю ў вачах углядаючыся ў чорныя фермы моста і маленькія шэрыя хаціны Лупалава, у беспарадку раскіданыя на тым баку Дняпра.

— Што ж галовы павесілі, саколікі? Ці не выпіць захацелі, алкаголікі? — старшына — і адкуль ён толькі ўзяўся? — стаіць над акопам і весела паглядае на нас. — Чаго зажурылыся, арлы? Вылазь сюды, вайна на перакур пайшла! Давай, давай, швідчэ, паснедаем, пакуль ціха.

Я ніколі не ўмеў піць гарэлкі. Але ж я салдат! Здрыгануўшыся ад агіды, следам за сябрам пазаліхвацку перакульваю сваю конаўку.

—Першы раз у жыцці замежныя кансервы ем,—хваліцца Кузя. — Галандскія, здаецца? Трохі падобныя на шпроты. Так. Грыш?

— Шпроты смачнейшыя.

— Ну, не кажы! А ўвогуле, чорт іх разбярэ: я і шпроты толькі аднаго разу паспытаў — у рэстаране, з першай палучкі.

За пяць мінут управіліся мы з трафеямі, толькі сыру паўгалоўкі пакінулі дзяўчатам.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

СТАРАЯ, АЛЕ ГРОЗНАЯ ЗБРОЯ

ВЫСТАЎКА ЗБІРАЕЦЦА Ў ПАДАРОЖЖА

Калі лічыць трох лаўрэатаў Ленінскай прэміі, якія падпісваюць свае работы папулярнейшым у Савецкай краіне імем «Кукрыніксы», за аднаго майстра, можна сказаць, што на выстаўцы, арганізаванай Саюзам мастакоў РСФСР і яго маскоўскім аддзяленнем, прадстаўлены роўна 30 мастакоў — масквічоў, якія працавалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў франтавым друку. Гэта, вядома, далёка не ўсе, хто змагаўся тады з ворагам грознай зброяй сатыры. І тое, што экспануецца на стэндах выстаўкі, далёка не ўсё, што было створана яе ўдзельнікамі ў ваенныя гады.

Большасць экспанатаў сапраўды унікальныя. Дастаткова сказаць, што глядач бачыць, напрыклад, такія творы, як плакат Кукрыніксаў, або плакаты ленінградскіх «Вокнаў ТАСС», якія паявіліся літаральна ў першую раніцу вайны. Узяты з асабістых архіваў мастакоў і праз дваццацігоддзе зноў убачылі святло пажоўклыя старонкі франтавых і дывізіённых газет, лісты з блакнотаў з накідамі баявых эпізодаў з партрэтамі герояў.

На выстаўцы прадстаўлены ўсе жанры савецкай графікі: і сатыра, і гумар, і плакат, і замалёўка.

Мастакі працавалі ў цяжкіх умовах. Малявалі параненымі, абмарожанымі рукамі, пры святле цьмяных капцілак. Самі выгручлівалі малюнкі на цынку, а калі яго не было, выразалі на лінолеуме, які аддзіралі ад падлог разбураных снарадамі будынкаў. І ўсё гэта рабілася пад жорсткім прэсам тэрміну: чакала газета, чакаў салдат!..

Нягледзячы на тое, што на выстаўцы прадстаўлена не «выбранае», а тое, што захавалася, уцалела, кожная работа нясе на сабе адбітак таленту і майстэрства, працы і натхнення.

На стэндах творы самых розных майстроў. Многія з іх пайшлі на вайну ў росквіце сваіх сіл, будучы прызнанымі ўжо мастакамі (Кукрыніксы, Б. Яфімаў, Б. Прарокаў, Б. Лео, А. Вязнікаў, А. Бажэнаў і іншыя). Для іншых, як напрыклад, зусім юнага чырвонафлотца Л. Самойлава, вайна была суровай акадэміяй, дзе яны капілі вопыт і шліфавалі майстэрства. У кожнага з удзельнікаў выстаўкі свая манера, свой пункт гледжання, але ўсіх аб'ядноўвае высокі сацыялістычны гуманізм, патрыятызм, нязгаснае пачуццё гумару.

На выстаўцы ёсць адна цікавая фатаграфія: мастак С. Тэлінгатар зазняты ў момант, калі ён малюе вялізную карыкатуру, выстаўленую потым на пярэдні край і якая выклікала шалёны агонь фашыстаў. Гэты факт быў не адзіны ў час вайны. Многія, а больш дакладна усе нашы мастакі, былі тады на пярэднім краі барацьбы з ворагам. І, нагадваючы пра гэта, выстаўка гаворыць, што сатыра — старая, але грозная зброя, ва ўсёй яе адточанасці і бляску — пастаянна знаходзіцца на ўзбраенні нашага народа.

Цяпер выстаўка рыхтуецца да вялікага падарожжа па краіне. Яна пабывае ў Ленінградзе, Мінску, Кіеве, у часцях і падраздзяленнях Савецкай Арміі.

Георгій КОФМАН,
былы рэдактар блакадных ленінградскіх «Вокнаў ТАСС».
(АДН).

ПЕСНІ ТАКТАГУЛА ЗА РУБЯЖОМ

Стогадовы юбілей з дня нараджэння вялікага кіргізскага акына-дэмакрата Тактагула Сатылганава ў Кіргізіі азнаменаваўся масавым выданнем на кіргізскай і рускай мовах яго натхнёных песень, а таксама прац літаратуразнаўцаў, прысвечаных яго творчасці. Рэзка ўзмацнілася цікавасць да яго твораў у многіх частках свету. У адрас Кіргізскага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі паступіла некалькі дзесяткаў заявак ад яго прадстаўніцтваў і грамадскіх арганізацый многіх краін з просьбай прыслаць зборнікі песень акына, кнігі пра яго, кінафільмы, карціны.

Як паведаміла карэспандэнту АДН старшыня Кіргізскага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі Тэлен Тургунбаева, толькі са снежня мінулага года ў адрас грамадскіх арганізацый сацыялістычных краін, а таксама ў Ірландыю, Італію, Канаду, Афганістан, Пакістан, Грэцыю, Дагамею, Індыю, Іран, Нарвегію, Швецыю, ААР, Танзанію і іншыя дзяржавы накіраваны двухтомнікі песень Тактагула, зборы яго твораў, зборнікі артыкулаў і кніг пра яго творчасць, партытуры сімфанічнай паэмы пра яго і іншыя творы.

— Мы ўпэўнены, — сказала Тэлен Тургунбаева, — што непасрэднае азнаямленне з творчасцю класіка нашай паэзіі паможа зарубежным сябрам лепш зразумець паэтычную душу кіргізскага народа, яго мары і ідэалы.

Мы ўжо маем некалькі пісем з падзякамі. Нашы сябры з Польшчы і Балгарыі паведамілі, што кнігі песень Тактагула карыстаюцца вялікім попытам, добра знаёмяць чытачоў з літаратурай кіргізскага народа. Цікавае паведамленне прыйшло з Пакістана. У снежні 1964 года ў бібліятэцы-чытальні прадстаўніцтва савецкіх таварыстваў сакратар пасольства Цімібаліеў прачытаў лекцыю пра Тактагула Сатылганава. Лекцыя выклікала такую вялікую цікавасць у пакістанскіх грамадзян, што яны папрасілі больш грунтоўна пазнаёміць іх з творчасцю акына і, у прыватнасці, паказаць ім фільм пра Сатылганава.

АДН.

Кадр з фільма «Апошняя ноч у раі».

Кадр з фільма «Аварыя».

ФІЛЬМЫ Ў ЛІПЕНІ

У нялёгкі час упершыню сустрэліся Праскоўя Ліхачова і Кацярына Аўчарэнка...

У доме ў Ліхачовай усё ідзе добра. Яна—прызнаны майстар ураджаяў, паважаны ў грамадстве чалавек. Ды і асабістае жыццё ўдавы-салдаткі быццам уладкавалася, увайшло ў берагі. Пасталела, вучыцца прыёмная дачка...

І вось, калі, здавалася, усе выпрабаванні мінулі,—стук у дзверы і глухаваты голас з вуліцы: «Адчыніце! Я—Кацярына Аўчарэнка... Дачка мая ў вас...»

«Дачка мая...» А Ліхачова і думаць забылася пра гэтую жанчыну, ды і не ведала яе зусім, — не гаварылі пра яе ў доме дзіцяці, калі Ліхачова брала там двухгадовую хворую дзяўчынку. За дзесяць гадоў жанчына, якая нарадзіла і кінула дзіця, нічым не нагадвала аб сабе. І вось яна ўваходзіць у хату яшчэ маладая, пагардлівая апранутая...

Так прыходзіць у дом Ліхачовай бяда... Так пачынаецца новая мастацкая кінааповесць «Маці і мачыха», створаная рэжысёрам Л. Пчолкіным на кінастудыі «Ленфільм» па сцэнарыі Г. Радава. Гэта фільм пра дабрату, пра высакароднасць савецкага чалавека.

Галоўныя ролі ў карціне выконваюць: Ліхачовай — Л. Сакалова; Кацярыны—Н. Ургант; Журбенкі—Н. Грыцэнка; Кругляковa—Я. Матвееў; Феакціставай — Е. Клюева; Яўсея—Я. Пятроў; Смальчыхі—Н. Фядосава.

У ліпені ленфільмаўцы перадаюць на суд гледачоў і яшчэ адну сваю новую работу—мастацкую кінааповесць «Аварыя». Аўтар сцэнарыя—В. Памеранцаў, пастаноўка А. Абрамава і Н. Бірмана. У ролі следчага Піліпенкі здымаўся народны артыст СССР Ю. Талубееў.

А вось што расказвае пра сваю новую работу—мастацкую кінакарціну «Апошняя ноч у раі», створаную на кінастудыі «Малдовафільм» па сцэнарыі Г. Малярчука і І. Прута, рэжысёр-пастаноўшчык А. Гардон:

— Шмат сыноў у Санды і ў кожнага свой лёс. Старэйшы, Павел — афіцэр румынскай арміі. Пятро загінуў за новую ўладу, змагаючыся ў радах партызан. Мікалай—мастак, два малодшых збіраюцца ўцякаць у Бухарэст, на пошукі лёгкага і прыгожага жыцця. У яе доме жывуць яшчэ ўдава загінуўшага партызана і яе сямігадовы сын, які чакае вяртання бацькі. І, нарэшце, сама Санда Кіцан—гаспадыня багатай кулацкай гаспадаркі, якая распараджалася ўсё жыццё дабром і лёсам людзей і горка паплацілася за гэта...

Усяго адзін дзень працягваецца дзеянне фільма. Але ён, гэты дзень, напоўнены вострымі канфліктамі, драматычнымі сітуацыямі.

Выпускаецца на экраны таксама новы эстонскі шырокаэкранны мастацкі фільм «Нуль тры». Аўтары сцэнарыя—Н. Адамян і Я. Волчэк, рэжысёр-пастаноўшчык — І. Яльцоў. Карціна прысвечана рабоце ўрачоў «Хуткай дапамогі».

Хто не ведаў у таксаматорным парку шафёра Лушку Кукушкіну—кемлівую задзірыстую дзяўчыну, якая ўмее пастаяць за сябе і ні ў чым не саступае мужчынам. Лушка прывозіла з рэйса вялікую выручку, ніколі не затрымлівалася ў чарзе, каб адрамантаваць машыну. Так і жыла яна—лёгка і бесклапотна, рэдка задумваючыся аб сабе і навакольных людзях. Але аднойчы...

Пра тое, што адбылося далей, гледачы даведаюцца, прагледзеўшы новую мастацкую кінааповесць «Лушка», створаную рэжысёрам Л. Бяснодарным і І. Самбарскім на Кіеўскай кінастудыі імя А. П. Даўжэнкі па сцэнарыі Л. Вакулоўскай.

Галоўную ролю ў кінакарціне выконвае артыстка Маскоўскага абласнога драматычнага тэатра В. Маёрава.

У ліпені будзе таксама дэманстравацца таджыкская шыроказкранная кінааповесць «Мірны час», пастаўленая рэжысёрам В. Кімягаравым па матывах аднайменнага рамана Ул. Хабура. Гэты фільм прысвечаны нашай моладзі.

З цікавасцю будуць прагледжаны і новыя мастацкія кінакарціны «Цяжкі пераход» («Арменфільм») і «Веселле» («Грузіяфільм»).

З зарубежных кінастужак гледачы змогуць прагледзець польскую—«Спынены палёт»; венгерскую—«Гісторыя аднаго кахання»; чэхаславацкую—«Дарога праз дрымучы лес»; югаслаўскую—«Шчаслівa, Кекец!»; галандскую — «Напад»; дацкую—«Дылема»; англійскую — «Вуглавы пакой»; фільм вытворчасці кінастудыі «ДЭФА» (ГДР)—«За мной, шэльмы» і іншыя.

НА ТУРЫСЦКАЙ СЦЕЖЦЫ

Гэты здымак зроблены на беразе возера Свіцязь. Гэта вучні 9 «а» класа адзінаццатай сярэдняй школы горада Ліды. Юныя турысты ў час гэтага паходу пабывалі ў старажытным Навагрудку, агледзелі выдатныя мясціны яго, наведалі дом-музей вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча.

Фота А. ПЕРАХОДА.
(БЕЛТА).

Януш ОСЕНКА

КУЛЬТУРНАЯ ХРОНІКА

З ЗАМЕЖНАГА ГУМАРУ

△ Адзін з новых польскіх фільмаў, задуманы спачатку як каляровы, будзе здымацца на чорна-белай плёнцы. Новае рашэнне звязана з тым, што акцёры, вымаўляючы да сораму слабыя дыялогі, чырванелі і станавіліся падобнымі на індыйцаў, а гэта пярэчыла задуме сцэнарыстаў.

△ Лялькі, якія выпускаюцца нашай цацачнай прамысловасцю, з кожным годам становяцца прыгажэйшыя. Калі некалькі гадоў назад дзіця, убачыўшы такую ляльку, страчвала прытомнасць, дык цяпер смялей згаджаецца заставацца ў адным пакоі з лялькамі, праўда, толькі разам з дарослымі.

△ У вострасюжэтным фільме, які ставіць цяпер студыя «Плёнка», удзельнічаюць тры дэтэктывы. Галоўны бухгалтар студыі ў мэтах эканоміі выкрасліў два, сцвярджаючы, што для таго, каб злавіць злачынцу, трэба мабілізаваць грамадскасць.

△ Для слухачоў, якія прыходзяць на канцэрты толькі з снабізму, Варшаўская філармонія адкрывае спецыяльную залу без канцэртаў, білеты са скідкаю.

△ Пісьменнік Ф. падаў у суд на выдавецтва, якое забракавала яго кнігу, і патрабаваў аплаты выдаткаў на ўрокі шведскай мовы. Пісьменнік Ф. растлумачыў суду, што ён збіраўся на гэтай мове сказаць прамову-падзяку пры ўручэнні яму Нобелеўскай прэміі.

△ Канчаткова ўстаноўлена, што гульня ў брыдж за кулісамі ў час паказу перашкаджае акцёрам тэатра «Разнастайнасць» засяродзіцца і сачыць за дзеяннем. Так, напрыклад, адзін з акцёраў, які адарваўся ад картаў для выканання сваёй ролі, пачуўшы заяву гофмаршала: «Наш кароль забіты», замест таго, каб крыкнуць: «Помста! Помста!», сказаў: «Значыць мы засталіся без узяткі».

△ Адзін з апошніх польскіх фільмаў заслужыў сабе рэпутацыю настолькі грамадскакарыснага твора, што некаторыя рэцэнзенты на ўсякі выпадак не сталі яго глядзець, каб лягчэй было напісаць пра яго пахвальны артыкул.

△ Як стала вядома, усе найбольш цікавыя кнігі будуць публікавацца не толькі ў нармальным выглядзе, але і форме адных вокладак — для людзей, якія хочуць мець вялікую бібліятэку, але не выяўляюць ахвоты да чытання.

△ Раман пісьменніка Р. пры пераробцы ў сцэнарый быў так сапсаваны, што цяпер непрыдатны нават для перапрацоўкі ў раман.

△ Мастак З. не падпісвае сваіх палотнаў, каб у будучым заслужыць сабе імя невядомага майстра дваццатага стагоддзя. Варта адзначыць, што мастаку ўдасца, відаць, дасягнуць сваёй мэты значна раней, бо ўжо цяпер ён зусім невядомы.

△ Несумленны рабочы сцэны тэатра ў Л., хочучы зарабіць на баку, прадаў налева тэатральную заслону, адразаючы ад яе метр за метрам. Спекулянт папаўся ў момант, калі розніца паміж узнятай і апушчанай заслонай знікла.

△ Хочучы памірыць двух вядучых акцёраў тэатра ў Н., рэжысёр інсцэніраваў «Гамлета» такім чынам, што галоўную ролю іграюць двое, якія выступаюць як сіямскія блізняты.

△ Як стала вядома, прэм'ера новай п'есы, якая павінна была адбыцца ў тэатры ў горадзе П., адкладзена, бо акцёры ўсё яшчэ не пайшлі са сцэны пасля папярэдняй прэм'еры — чакаюць апладысментаў.

△ Рэжысёр З. закончыў нядаўна фільм, пастаўлены ім спецыяльна для людзей хціўых, якія, каб расквітацца з непрыяцелямі, будуць раіць глядзець яго знаёмым.

З часопіса «Польскі агляд».

Малюнкі мастака З. Ленгрэна. (Часопіс «Польскі агляд»).

РАСКОПКІ НА РАДЗІМЕ АЛЯКСАНДРА МАКЕДОНСКАГА

У сваіх гнеўных выкрыццях, накіраваных супраць Філіпа II, Дэмасфен ахарактарызаваў старажытную Македонію, як варварскую краіну. Аднак цяпер археолагі ўстанавілі, што месца нараджэння Аляксандра Македонскага, вялікага палкаводца старажытнасці, — Пелла — сталіца Македоніі — была горадам такой культуры і багацця, якія могуць быць параўнаны з культурой і багаццем самых Афін. Ранейшая ацэнка доўгі час бытавала ў сувязі з тым, што Пелла была разбурана рымлянамі ў 168 годзе да нашай эры. Паступова, засыпанае векавымі напластаваннямі, месцанараджэнне старажытнай Пеллы было забыта.

У 1957 годзе ў Пелле, размешчанай у 40 кіламетрах на паўночны захад ад Салонік, грэчаскі селянін, які напаў ямy ў падвале свайго дома, нечакана знайшоў дзве іанічныя калоны з вапняку, якія аказаліся часткаю вялікага палаца дома радавітага жыхара старажытнай Пеллы. На тым месцы, якое цяпер вызначана як месца размяшчэння старажытнага горада Пеллы, археолагі знайшлі мазаічныя падлогі выключнай прыгажосці.

Але найбольш цікавым адкрыццём аказалася знаходка вялікага кругавога збудавання, зробленага 2 300 гадоў назад. Па меркаванню вучоных, гэта збудаванне, якое мае 30,5 метра ў дыяметры,—грабніца, акружаная трыма ратондамі дыяметрам у 5,6 метра кожная. Комплексаў падобнага стылю нідзе да гэтага часу ў Грэцыі не знаходзілі.

Таксама выпадкова другі селянін раскапаў вяршыні вялікіх рыфленых калон. Адзін з археолагаў Хараламбос Макаронас, кіраўнік раскопак у Пелле, мяркуе, што калоны з'яўляюцца часткаю храма Афіны, багіні мудрасці, пабудаванага ў 5 стагоддзі да нашай эры, пра які пісаў рымскі гісторык Лівій.

Археолагі паставілі задачу адшукаць месцазнаходжанне вялікага палаца ў Пелле, дзе па паданнях нарадзіўся Аляксандр Македонскі.

В. ГЕОРГІЕЎ.
(ТАСС).

ДА ПАСЛУГ ЮНАЦТВА

Дванаццаціпавярховая маладзёжная базагасцініца пачала будавацца на Заслаўскім вадасховішчы. Круглы год дзверы яе будуць адчынены для тых, хто прыедзе сюды на адпачынак. У комплекс уваходзіць жылая частка, дзе на дзесяці паверхах змогуць размясціцца 500 чалавек. Нумары вельмі зручныя і ўтульныя. У першых двух паверхах будынка запраектаваны рэстаран на 400 месц з танцавальнай пляцоўкай і банкетнымі заламі, клубныя памяшканні. Глядзельная зала на паўтысячы месц можа быць выкарыстана для паказу кінафільмаў, правядзення канцэртаў і ўрачыстых вечароў. Унізе будуць знаходзіцца таксама гандлёвыя залы, памяшканні для ўстаноў бытавых паслуг. Тэраса-пляцоўка верхняга паверха выкарыстаецца для салярыя і кафэ. З саракаметровай вышыні наведвальнікі змогуць аглядаць наваколле.

Паблізу гасцініцы на адкрытых адхонах-тэрасах прадугледжаны спартыўныя пляцоўкі і крытая баскетбольная пляцоўка, якую можна трансфармаваць для відовішч або лекцый. На адзінаццацігектарным участку да паслуг адпачываючых будуць пляж, ценявыя павеці, лодачная станцыя. Зарэзервіравана спецыяльнае месца для наладжвання летняга палатачнага гарадка.

Праз два гады будынак, праект якога распрацаваны ў інстытуце «Белдзяржпраект» архітэктарам Ю. В. Шпітам і Э. Р. Вішнеўскай, уступіць у строй.

БЕЛТА.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

29 чэрвеня

Першая праграма. 11.00—канцэрт. «Спявае Іаванна». 16.55 — праграма перадач. 17.00 — урачысты сход, прысвечаны першаму выпуску спецыялістаў Універсітэта дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы. Перадача з Крамлёўскага Палаца з'ездаў (М). 18.30 — тэлевізійныя навіны. 18.50 — «У свеце мастацтваў». «Экскурсія па залах Дзяржаўнага мастацкага музея БССР (перадача другая). 19.30 — канцэрт. Перадача з Крамлёўскага Палаца з'ездаў (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — рашэнні сакавіцкага Пленума ЦК КПСС — у жыццё. Вечар пытанняў і адказаў у клубе «Колас». «Аб праблемах у жывёлагадоўлі». 22.45 — канцэрт па заяўках работнікаў сельскай гаспадаркі.

Другая праграма. 18.30 — «У стэпе пад Херсонам» (аб людзях калгаса імя Леніна). (М). 19.00 — «Маладзее старажытны Талін». Перадача з Таліна. 19.30 — «Карамболь». Мастацкі фільм. 21.00 — канцэрт эстраднага аркестра Азербайджанскага радыё і тэлебачання. 22.00 — «Дзень апошні — дзень першы». Перадача з Цэнтральнага Дома акцёра імя Яблачкінай (М).

30 чэрвеня

Першая праграма. 11.00—«Карамболь». Мастацкі фільм. 16.55 — праграма перадач. 17.00— для школьнікаў. «Добрае слова — мара». 17.40 — рашэнні сакавіцкага Пленума ЦК КПСС—у жыццё. «Вечар пытанняў і адказаў у клубе «Колас». «Аб праблемах генетыкі». 18.25 — тэлевізійныя навіны. 18.40 — «Дні нашага жыцця». Рэпартаж з Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава. 18.55 — спартыўная перадача. 19.40 —«Перабежчык». Спектакль Чарнавіцкага дзяржаўнага ўкраінскага музычна-драматычнага тэатра імя Вольгі Кабылянскай. 22.20 — «Кузля маладых кадраў». Выступленне рэктара БДУ А. Н. Сеўчанкі. 22.30 — «Пошук працягваецца». Кінанарыс. 22.50 — «Гартаючы каляндар». 23.40 — «Крылатая маладосць». Тэлевізійны фільм.

Другая праграма. 17.40 — тэлевізійныя навіны (М). 18.00 — «Навука — вытворчасці» (М). 18.30 — «Знаёмства з операй». Дж. Расіні. «Севільскі цырульнік». Спектакль Міланскага тэатра «Ла Скала» (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «У эфіры—«Маладосць». «Арбіта» (М). Пасля заканчэння футбол — «Дынама» (Кіеў) — «Спартак»—(Масква) (у запісе).

1 ліпеня

Першая праграма. 16.25 — праграма перадач. 16.30 — для малышоў. «Бурацiна ў краіне загадак». 17.00 — для школьнікаў. «Дзеці ў дзюнах». Рэпартаж з піянерскага лагера. Перадача з Рыгі (на Інтарбачанне). 17.30 — для веруючых і няверуючых. «Прыстасаванне царкоўнікаў і сектантаў да сучасных умоў». Гутарка аспіранта БДУ Р. Грабеніка-ва. 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — «Вернутая песня». Кінанарыс. 18.30 — канцэрт секстэта домр Беларускага радыё і тэлебачання. 19.00 — «Эстафета навін» (М). 22.00 — «Кантаджыра». Фестываль італьянскай песні. Перадача з Зялёнага тэатра ЦПКіА (М).

Другая праграма. 17.30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Падарункі сяброў». Кінафільм «Вясёлыя канікулы» (Венгрыя) (М). 17.50 — мультыплікацыйны фільм (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 19.00 — урыўкі з оперы «Утаймаванне свавольніцы» па аднайменнай камедыі Шэкспіра. 19.55 — «Нява шле прывітанне сталіцы». Кінанарыс. 20.20 — «Артыст з Каханаўкі». Мастацкі фільм.

КУТОК КАЛЕКЦЫЯНЕРА

АБАЙ КУНАНБАЕЎ, УСЕВАЛАД ІВАНАЎ

На сотнях паштовых марак—партрэты выдатных пісьменнікаў, паэтаў, драматургаў. Цяпер да іх далучыліся яшчэ дзве, прысвечаныя памяці Абая Кунанбаева і Усевалада Іванава.

Імя Абая Кунанбаева (1845—1904), вялікага казахскага паэта-асветніка шырока вядома не толькі на яго радзіме — Казахстане і ў сацыялістычных рэспубліках Сярэдняй Азіі, але і ў любым кутку СССР, на ўсім Усходзе. Рашучы вораг насілля, эксплуатацыі, родавых міжусобіц, Абай заклікаў свой народ да адукацыі, умацавання сувязей з перадавой рускай культурай. Ён пераклаў на родную мову многія творы класікаў рускай літаратуры, зблізіўся з рускімі рэвалюцыянерамі —барацьбітамі за свабоду ўсіх народаў, якія насялялі Расійскую імперыю. Пяру Абая Кунанбаева належыць многа выдатных арыгінальных твораў. Ён па праву лічыцца заснавальнікам новай казахскай пісьмовай літаратуры.

Аўтар малюнка маркі мастак Васіль Заўялаў злева напісаў партрэт Кунанбаева на фоне нацыянальнага арнаменту. Справа пададзены тыповы пейзаж Казахстана. Ля юрты—землякі Абая слухаюць песні свайго паэта. Марка двухкаляровая, выкананая ў фіялетавай гаме. Яе намінал—чатыры капейкі.

Па малюнку таго ж мастака надрукавана марка, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння таленавітага савецкага пісьменніка Усевалада Іванава (1895—1963). Партрэт Іванава пададзены злева ад ілюстрацыі да яго сусветна вядомага твора «Бронецягнік 14-69», які ўвайшоў у залаты фонд савецкай драматургіі. У малюнку спалучаюцца чорныя і светла карычневыя адценні. Кошт маркі—чатыры капейкі.

Друк абедзвюх марак—глыбокі. Зубцоўка — грабенчатая. Памер па перфарацыі—30 на 4' міліметры.

Марыя КАВАЛЕВА.
(АДН).

ТУТ БЫЛІ НАШЫ АКОПЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

А старшына тым часам «праясняе абстаноўку». Аказваецца, мы ўжо даўно ў нямецкім тыле, Смаленск ужо ў іх... Пусцілі, значыцца, і за Дняпро... Кіламетраў мо з дзвесце... Яно, канешне, здорава, што мы не ўцякаем, што мы тут, але калі там не затрымаюць, дзела наша табак, гэта ўжо як піць даць. Давядзецца і нам драпаць, вось што крыўдна... Сюды, на мост, мусіць, больш не палезуць, узгрэлі іх тут як след — от жа ціха, не відаць і не чуваць, няйначай аж на той канец Лупалава дабеглі... З вакзала, адтуль будуць ціснуць... Не люблю вулічнай вайны: не разбярэш, дзе свае, дзе чужыя...

— А нам з вамі заданне на мост ісці.

— Зноў? — вырвалася ў мяне.

— Эге ж, — ледзь прыкметна ўсміхнуўся старшына. — Утрох пойдзем. Шчэ дакументаў трохі назбіраемо, а галоўнае — аўтаматаў там багата валяецца, ну і ранцы ў іх, мабыць, не пустыя. А байцам нашым есці трэба ці не? Як, хлопцы, трэба байцам есці, га?.. Ото ж, я так і думаў, што мы з вамі і без палітінфармацыі абыдземся: народ жа граматны, студэнты, не то што дундукі шэрыя. Ну, канчай начаваць, пайшлі!

...Нагружаны, як панесці, Кузя пайшоў наверх, я таксама сабраўся ісці, як раптам заўважыў нейкае дзіўнае ружжо: доўгае, з раструбам, яно нагадвала дапатопны мушкет — у гарадскім музеі былі такія. Я нагнуўся падабраць гэтае дзіва і... сустрэў насцярожаны позірк таго, каго лічыў трупам. Я выхапіў наган і наставіў яго прама ў жаласна міргаючыя чорныя вочы.

— Таварыш старшына, тут жывы адзін!

— Дабі — не ўзнімаючы галавы, спакойна азваўся ён. — І без яго моташна, куды яго потым... Яны нашых не дужа шкадуюць, бачыў я...

— Я естэм поляк, — паспешліва прамовіў чарнавокі. — Я естэм поляк... Не тшэба страляць, пане! Война плёхо...

І з нейкай асаблівай перакананасцю, як быццам выкладвае самы неабвержны доказ таго, што ён мае права жыць, тыцкае пальцам у разадраны куляй бот і жаласна паўтарае адно і тое ж:

— Вось нога, нога... Плёхо... Война плёхо... Не тшэба страляць, пане!

Падышоў старшына, крыху пастаяў, хмура гледзячы на ляжачага немца, затым рэзка нагнуўся, схапіў яго за каўнер і рыўком паставіў на ногі.

— Ну, трымайся, ваяка! — прабурчэў ён, падстаўляючы шыю — Гэй Грыцько, дай яму шо-небудзь абаперціся!

Я ўсміхнуўся, падняў тое самае ружжо, павярнуў яго прыкладам дагары і сунуў пад паху немцу. Так мы і рушылі па мосце назад, да валу: наперадзе, абняўшы за шыю геркулеса-старшыну, тоненькі, даўганогі немец, а ззаду я, з галавы да пят абвешаны аўтаматамі, сумкамі і ранцамі.

Паглядзець на жывога немца збегліся многія, у большасці наш брат, апалчэнцы. Абступілі і моўчкі глядзяць, як санітар спрытна перавязвае невялічкую ранку на жыліста-валасатай назе немца.

— Няйначай, косць зачапіла, — спагадліва гаворыць нехта. — І чаго ты толькі лез да нас, дурыла? Нашто слухаўся свайго дурнаватага Гітлера?

Твар у немца пакутліва-сумны, а вочы радасныя: здаецца, ніхто не збіраецца яго забіваць.

— Бач, як яно ваяваць з намі! — смяецца санітар. — Ці табе ў Германіі цесна было?

— Я не Германія, о не! — усміхаецца салдат.— Я естэм поляк!

— Ану, ану, пастой, — цісне́цца праз натоўп Кузя. — Хто, ты паляк?

— Ага, ага, я естэм поляк.

— Так, так... Паляк, значыцца?

Кузя ледзь не кідаецца на палоннага, крычыць:

— Я табе, падла, пакажу паляка, век будзеш помніць! Я естэм поляк! Я! А ты пескі сын! У, гад! Жмія встрэнта, ешчэ за паляка падаеш сень! Яшчэ раз тылька польскім назвеш сень, то я з цебе шкоцкі розбіфт зробен! У найлепшым гатунку, з крвён!.. Ды пусціце вы, чэрці, цэ будзе гэты паршывы ганс, маць яго...

І, расціраючы трохі перацiснутыя таварышамі рукі, ужо спакайней гаворыць:

— Ежэлі естась палякем, то на д'ябла нямецкі мундзір носіш?

— То ж война, пане, — дрыжачым галасам адказаў той. — Але я естэм невінны, я не хцялам, пшысенгам богем! Мне мабілізавалі... не згодзішдо абозу карнэго, а там пэўна смерць... У іх сіла, ніхто не можа ім рады даць: ані чэсі, ані французы, ані англійцы... Вас таксама біён... А хто я? Шары чловек.

— В'юць ды крывёю ўмываюцца! — умяшаўся пажылы дзядзька ў сінім камбінезоне. — Думаеш, да Дняпра дайшлі, дых і ўсё? Скулля!

Кузя дастаў папяросы, прыпаліў і, падумаўшы, кінуў адну салдату:

— На, куры, чорт з табою... Як сень называш?

— Казімеж Вуйцык, — паспешна адказаў той, нерашуча ўзяў папяросу, баязліва паглядаючы на гэтага лахматага хлопца, які то кідаецца біцца нямаведама за што, то раптам папяросамі частуе.— Казімеж Вуйцык, прошам пана, з Кракова, механік.

— Эйш ты, цёзка, значыць, — усміхнуўся Кузя. — А я Казімір Крундзёл з Магілёва. Праўда, не механік, а слесар.

Салдат заківаў і асцярожна запытаў:

— Нех пан пове, для чэга пан і інні панове ў цывільным убраню?

— А мы і ёсць цывільныя.

— Разумем, вас такжэ мабілізавалі?

— Каго мабілізавалі, нас? — пакрыўдзіўся Кузя і пацiснуў плячыма. —От жа ёлуп! Ацлоха, як кажа наш Бэрка. Гэта ў вас у Кракаве ўсе такія прыдуркі або ты адзін такі пень, га?

— Не разумем пана. Цо пан муві?

— Пытам сень, чы ў твоім Кракове вшысцы тацы глупцы, жэ звыклых жэчы не разумеён! Мы ахатніцы, зразумялі?

Салдат адмоўна пакруціў галавой і перапытаў:

— Вы жалнежы? Альбо... камісары?

І доўга пацешна міргаў вачыма, гледзячы на байцоў.

— Эй, дзе тут у вас палонны?—вынырнуў з кустоў нейкі незнаёмы сержант. — Вось гэты, ці што?.. Ну, давай, ганс, пайшлі!

— Куды ты яго? — запытаў нехта.

— На кудыкіну горку, — ляніва сплюнуў сержант і нецярпліва прыкрыкнуў: — Давай, варушыся, няма калі мне тут з вамі валандацца! Ком!..

Да вечара было параўнальна ціха, толькі здалёк, з-за Дняпра немцы зрэдку кідалі міны. У трафейны бінокль відна была нават іхняя мінамётная батарэя за лугам, ля авіягарадка. Некалькі голых немцаў рэзаліся ў карты пад сасонкай; адзін, у трусах, корпаўся ля мінамёта. Час ад часу хто-небудзь кідаў карты, ляніва пацягваючыся, ішоў да штабеля скрынак з мінамі, адтуль да мінамёта і... вззз-зз!.. Гахх! — ляцелі трэскі і асколкі над нашымі галовамі. Як у сябе дома, на палігоне, — гэта больш за ўсё выводзіла нас з раўнавагі, — а дастаць іх няма чым, у нас ніводнага снарада, ні міны... Кузя выпусціў у іх бок амаль два дыскі, плюнуў і заваліўся ў акоп спаць. Заснуў і я.

А вечарам мы нават збегалі да нашых інстытуцкіх дзяўчат у шпіталь, і Люська падарыла мне цудоўны сіні берэт з зорачкай. «Да заўтра!» — сказала яна.

І вось ужо дваццаць тры гады ніяк не можа надысці гэтае заўтра...

...Калісьці гэта быў мой родны горад. Замшэлыя камяніцы гарадскіх брам на ўскраінах, таямнічы падземны ход са старажытнага манастыра, напалеонаўскія гарматы на валу, жоўты блін сонечнага гадзінніка на плошчы. Горад, наскрозь прапахлы антонаўкамі... Я прыехаў сюды ў камандзіроўку, прыехаў пісаць нарыс пра нейкага цуда-рацыяналізатара і вось ужо трэція суткі бадзяюся без дай прычыны, як апантаны, па вуліцах. Быццам шукаю нечага і не магу знайсці.

Літаратура і мастацтва 4

Аўторак, 29 чэрвеня 1965 года.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-28-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі—3-44-04, выдавецтва—6-25-19, бухгалтэрыі—6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда». Індэкс 63856. АТ 10146